АСПЕКТ ПРАБЛЕМЫ
ЦІ ТРЭБА РАТАВАЦЬ БАЛОТЫ? 2 стар.
ГАСЦЁЎНЯ
СУСТРЭЧА З ДЫРЭКТАРАМ ЛЯДОВАГА ПАЛАЦА Алегам КУРЧЭЎСКІМ 3 стар.
ДЫПКУР'ЕР
НЯМЕЦКІХ ДЫПЛАМАТАЎ ЦІКАВЯЦЬ БЕЛАРУСКІЯ СМІ 3 стар.

ЖЫЦЦЁВЫЯ СЮЖЭТЫ
РАБІНЗОН З ЛЮБАНІ 4 стар.
ХРЫСЦІЯНСКАЯ СТАРОНКА
"ЖЫЦЦЁ І ВЕРА" 5 стар.
ЗВАРОТНАЯ СУВЯЗЬ.
АРМЕНІЯ. РАСІЯ. 6 стар.

БЕЛАРУСЫ Ў СВЕЦЕ
"СВІТАНАК" ВА ЎЗБЕКІСТАНЕ 6 стар.
УРАЖАННІ
"ПЯШЧОТНАСЦЬ І ГНЕЎ" Станіслава ПАЛОДЗЬКІ 7 стар.
АПАВЯДАННЕ
Мікалай МАНОХІН. ПЕРШЫ ПАЦАЛУНАК І... ОРДЭН "СЛАВЫ" 8 стар.

АГУЛЬНАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА Ў 48 КРАІНАХ

Голас Радзімы

Штотыднёвая газета для суайчыннікаў за межамі Беларусі Выдаецца з 6 красавіка 1955 года

23 кастрычніка 2002 года. № 43 (2809) Цана 148 рублёў E-mail:golas_radzimy@tut.by

хроніка жыцця

ДА ЎГОДКАЎ КУПАЛЫ І КОЛАСА

24 кастрычніка ў Віцебску адбудзецца абласны конкурс "Паэзіі радок чароўны".

Ён прысвечаны 120-й гадавіне з дня нараджэння народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа. Па ўмовах конкурсу ўдзел у ім прымае выключна моладзь ва ўзросце ад 15 да 25 гадоў.

Гонар правядзення своеасаблівага "аўкцыёну" творчасці маладых выпаў Віцебскаму дзяржаўнаму універсітэту імя Машэрава. Чытанне і слуханне твораў юных "жаўрукоў" дазволіць вызначыць, ці ёсць у народных песняроў дастойныя нашчадкі і якой якасці паэтычнае "насенне".

РОДНЫ КРАЙ НА ЎЛАСНАЙ КАРЦЕ

Выдатны дапаможнік атрымалі ў новым навучальным годзе школьнікі Смаргоничыны. Ім стаў фізіка-геаграфічны атлас раёна.

А склалі яго іх равеснікі — навучэнцы гарадской гімназіі пад кіраўніцтвам настаўніцы геаграфіі Тамары Санюк.

Работу юных даследчыкаў падтрымала раённая інспекцыя па экалогіі і ахове навакольнага асяроддзя. Прафінансаваў жа выпуск нагляднага дапаможніка ў колькасці 500 экземпляраў індывідуальны прадпрымальнік з суседняга Маладзечна.

ЦЫБУЛІ ХОПІЦЬ

Фота БелТА.

Трэці год займаюцца вырошчваннем цыбулі ў калгасе імя Фрунзе Акцябрскага раёна Гомельшчыны. Сёлета з 15 гектараў сабрана 132 тоны цыбулі "стрыганоўскай". З поспехам рэалізуюць яе не толькі кансервавым заводам, але і насельніцтву. Цыбуля салодкая на смак, добра захоўваецца.

НА ЗДЫМКУ: на сартаванні цыбулі ў калгасе імя Фрунзе працуюць пенсіянеры Людміла ЦЫГЕЛЬНІК і Надзея ДАНЧАНКА. Плату яны атрымліваюць натурпрадуктам — цыбуляй.

"ВІКІНГІ НА УСХОДЗЕ"

Так называецца выстава, якую разам з ініцыятарам – Дзяржаўным гістарычным музеем Швецыі і іншымі дзяржаўнымі ўстановамі гэтай краіны – рыхтуе да паказу Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі.

Выстава ўпершыню дасць магчымасць убачыць матэрыяльныя сведчанні колішняй прысутнасці скандынаваў на тэрыторыі нашай краіны і абяцае стаць з'явай, адметнай у культурным жыцці.

На выставе будуць дэманстравацца як шведскія, так і беларускія экспанаты, прадстаўленыя Брэсцкім абласным краязнаўчым музеем, Пінскім музеем беларускага Палесся і іншымі музеямі краіны...

ПОШТУ РАЗВЯЗЕ ЯМШЧЫК

Як і ў далёкім мінулым, на Віцебшчыне пошту будуць развозіць ямшчыкі.

Кіраўніцтва "Віцебскаблпошты" такім чынам хоча трохі зэканоміць на транспартных выдатках і паскорыць дастаўку лістоў, газет і часопісаў у аддаленыя вёскі. Эксперымент (дарэчы, упершыню ў Беларусі) будзе праводзіцца ў Браслаўскім і Міёрскім раёнах.

Зараз вырашаюцца пытанні закупкі коней, брычак, стварэння баз для ямшчыкоў. Добры конь каштуе 300 і больш долараў, некалькі соцень долараў у год трэба патраціць на сена і гэтак далей. Але ж адміністрацыя аблпошты ўпэўнена, што ўсе затраты хутка акупяцца. І паедуць ямшчыкі ў падарожжа па XXI стагоддзі...

ПЕРШЫ СНЕГ

Як і папярэджвалі сіноптыкі, цыклон, што завітаў да нас, нагадаў пра зіму.

Праўда, на ўсю Беларусь снегу чамусьці не хапіла, і па дахах шмат дзе барабанілі асеннія дажджы. А вось у цэнтральных і паўночна-заходніх раёнах, адзначылі ў Рэспубліканскім гідраметцэнтры, утварылася снежнае покрыва вышынёй ад 1 да 8 сантыметраў.

Акурат на Пакровы снег выраўнаў накрыць бялюткай байкавай коўдрай і Мінск. Між тым снег амаль у сярэдзіне кастрычніка не дзіва. Нязвыкла ранняе і няўстойлівае снежнае покрыва адзначалася ў Мінску 29 верасня 1972 года, а ўстойлівае — 29 кастрычніка 1956 года. Цяперашняя ж коўдра кароткачасовая, бо чарговы цыклон з захаду нясе пацяпленне і дажджы.

Падрыхтавала Ларыса ЛАЗАР.

захавай традыцыю

САЛІГОРСКІ "КАЛАРЫТ"

Як вядома, Салігорск – горад шахцёраў. Славіцца ён не толькі поспехамі калійшчыкаў, але і талентамі, беражлівымі адносінамі да народнай спадчыны Міншчыны. Сведчанне таму і поспех вакальнага гурта "Каларыт" вытворчага аб'яднання "Беларуськалій".

Фота Віктара ГАНЧАРЭНКІ.

талака

БІБЛІЯТЭКУ БУДУЕМ РАЗАМ

У 2002-2005 гадах плануецца ажыццявіць узвядзенне унікальнага будынка Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску.

Сёння галоўная беларуская бібліятэка, якая нядаўна адзначыла сваё 80-годдзе, — сапраўдная інтэлектуальная скарбніца, яна налічвае ў сваіх фондах звыш 7,5 мільёна выданняў больш як на 50 мовах свету. Сярод іх нямала старажытных рукапісаў, старадрукарскіх і рэдкіх кніг. Напрыклад, старажытнаіндыйская паэма "Рамаяна" ў форме пергаментнага скрутка, Евангелле, выдадзенае ў XVI стагоддзі, якое трымаў у руках Пётр Мсціславец, шэраг прац нідэрландскага першадрукара Крыстафа Плантэна, а таксама царкоўная літаратура, выдадзеная ў XVI стагоддзі ў Маскве.

Аднак цяперашні стан матэрыяльна-тэхнічнай базы не адпавядае статусу Нацыянальнай бібліятэкі. Перспектыва развіцця найважнейшага інфармацыйнага фонду краіны залежыць ад узвядзення новага сучаснага бібліятэчнага комплексу.

Выкананне праекта, які абяцае стаць адным з найпрыгажэйшых будынкаў Еўропы, у запланаваны тэрмін можна ажыццявіць пры актыўнай падтрымцы спонсараў, айчыннай і замежнай грамадскасці.

У ходзе рэспубліканскай акцыі па зборы сродкаў на будаўніцтва новай Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, якая пачалася ў кастрычніку, на спецыяльны рахунак ужо паступіла звыш двух мільярдаў рублёў. Амаль трэць сродкаў пералічылі мінчане.

Для арганізацый і асоб, якія гатовы аказаць падтрымку ў будаўніцтве новай бібліятэкі, паведамляем адрас Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі: Рэспубліка Беларусь, 220636, г.Мінск, вул. Чырвонаармейская, 9, дзяржаўная ўстанова "Нацыянальная бібліятэка Беларусі"; факс: 229-24-94, тэл.: 227-54-63, e-mail:sol@nacbibl.org.by, http//natlib.org.by. Банкаўскія рэквізіты: р/р 3620000000086 у АСБ "Беларусбанк", філіял 525 г.Мінска, код 122.

ЧЫТАЙЦЕ «ГОЛАС РАДЗІМЫ» Ў ІНТЭРНЭЦЕ!
http://golas.promedia.by

дабрачыннасць

ГУМАНІТАРНАЯ ДАПАМОГА З КАНАДЫ

Дабрачынная арганізацыя "Канадская дапамога ахвярам Чарнобыля" (г.Броквіль, Антарыа, Канада) даставіла ў Беларусь чарговую партыю гуманітарнай дапамогі (7 кантэйнераў) агульным коштам каля 5 мільёнаў долараў ЗША.

Традыцыйна гуманітарны груз гэтай канадскай арганізацыі накіроўваўся ва ўстановы сістэм аховы здароўя, адукацыі і сацыяльнай абароны Чавускага і Хоцімскага раёнаў Магілёўскай вобласці. На гэты раз кантэйнеры з лекамі і медыцынскім абсталяваннем атрымаюць таксама і бальніцы Бешанковіцкага, Гарадоцкага і Шумілінскага раёнаў Віцебскай вобласці.

Разам з дырэктарам арганізацыі Дэйвам Шо ў Чавускі раён прыбылі канадскія інжынеры, каб прадоўжыць вывучэнне магчымасці будаўніцтва водаачышчальных збудаванняў.

За 4 гады свайго супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь дабрачынная арганізацыя "Канадская дапамога ахвярам Чарнобыля" даставіла больш за 40 кантэйнераў з гуманітарным грузам агульным коштам каля 13 мільёнаў долараў ЗША.

Галіна ВІР.

*NEWS FROM BELARUS * БЕЛОРУССКИЕ НОВОСТИ * BIALORUSKIE WIADOMOSCI * NOTICIAS DE BELARUS * БІЛОРУСЬКІ НОВІНІ *

з прэс-канферэнцыі

НАВІНКІ ВЫДАВЕЦТВА "БЕЛАРУСЬ"

У Грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы адбылася презентацыя кніг выдавецтва "Беларусь", якое аб'яднала тры дзяржаўныя выдавецтвы – "Полымя", "Ураджай" і "Беларусь". Сёння галоўны рэдактар "Беларусі" – Алена Законнікава. Яна і прадставіла першую з нядаўна выдадзеных кніг – альбом "Іван Міско", прымеркаваны да 70-годдзя скульптара.

Іван Міско вядомы перш за ўсё як аўтар помніка-мемарыяла ў Жодзіне, прысвечанага маці-патрыётцы Настассі Купрыянавай (1975 год), пяцёра сыноў якой загінулі на вайне.

Іван Міско быў таксама адным з аўтараў помніка Максіму Горкаму, які ведаюць і малыя, і дарослыя: ён усталяваны ў Дзіцячым парку, што носіць імя рускага пісьменніка.

Цыкл прац Івана Міско — гэта выявы дзеячаў беларускай гісторыі і культуры. Тут — "Францішак Скарына" (1992), "Ефрасіння Полацкая" (1992). А таксама сучаснікі Івана Міско — "Стафанія Станюта" (1984), "Ярмоленка-старэйшы" (1984), "Янка Маўр" (1984), "Яўген Цікоцкі" (1967). Адна з любімых тэм скульптара — касманаўтыка. Ён стварыў галерэю скульптурных партрэтаў касманаўтаў і астранаўтаў з многіх краін свету. Цяпер Іван Міско працуе над помнікам Льву Сапегу, які хоча ўстанавіць у Слоніме.

Праца над кнігай Валянціна Калніна "Мірскі замак" пачыналася ў выдавецтве "Полымя" ў лютым гэтага года. Цяпер яна выйшла ўжо ў "Беларусі" накладам 2 тысячы экземпляраў. Па словах аўтара, атрымалася "настальгічнае выданне". "Гэта зусім іншая гісторыя. Я ж расказваю пра тое, як жыў Мір, якім быў замак калісьці". Як гаворыць А.Законнікава, "Мірскі замак" зможа стаць прадстаўнічым адлюстраваннем помніка беларускага дойлідства. Такую кнігу нясорамна прапанаваць шматлікім наведвальнікам Міра. Пакуль жа каля замка гандлююць самадзейнымі фотаздымкамі і кустарнымі вырабамі. Характэрна, што пэўную частку тыражу ўжо замовілі польскія кнігараспаўсюджвальнікі.

І яшчэ адна кніжная навінка — цікавы альбом "Мінск незнаёмы. 1920–1940 гады", які змяшчае 250 фотаздымкаў (тыраж 2 тысячы). Ілля Куркоў, аўтар-укладальнік выдання, кажа: "Гэты перыяд з'яўляецца ў нейкім сэнсе белай плямай у гісторыі сталіцы. Ёсць фота Мінска на дарэвалюцыйных паштоўках, ёсць пасляваенныя. Але Мінск 20–40-х гадоў — загадка. Справа пошуку візуальнай інфармацыі ўскладнялася некалькімі абставінамі. Па-першае, у тыя часы горад меў стратэгічнае значэнне, уваходзіў у прыгранічную зону, таму фатаграфаваць на вуліцах было забаронена. Па-другое, тыя здымкі, якія ўсё ж былі, згінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Большасць мінчан, да якіх я звяртаўся, казалі, што ў іх асабістых архівах былі здымкі Мінска, але дом згарэў, а з ім і фатаграфіі".

Тым не менш Ілля Куркоў, выкарыстаўшы матэрыялы Нацыянальнай бібліятэкі, Нацыянальнага архіва, перыядычнага друку, дае чытачу магчымасць уявіць, якім быў наш горад паміж дзвюма разбуральнымі войнамі XX стагоддзя. Кнігу варта ўбачыць дзеля разумення, што зрабіла з Мінскам гісторыя: спачатку рэвалюцыя, потым вайна, які ён цяпер. А паглядзеўшы на "Мінск незнаёмы", "Мірскі замак" і на працы Івана Міско, яшчэ раз упэўніваешся: у Беларусі ёсць што любіць і зберагаць.

Алена СПАСЮК.

выставы

МЭБЛЯ, ДЫЗАЙН, ІНТЭР'ЕР...

Нацыянальны выставачны цэнтр "Белэкспа" ажыццявіў аб'яднаны праект: адначасова ў двух павільёнах экспануюцца 9-я спецыялізаваная выстава-кірмаш "Мэбля-2003" і 5-я спецыялізаваная выстава "Дызайн. Інтэр'ер".

Праект сабраў звыш 150 фірм розных форм уласнасці з Беларусі, Расіі, Украіны і Літвы. Асноўная мэта выставы "Мэбля-2003" — заключэнне дагавораў на пастаўку прадукцыі на 2003 год, паказ найноўшых распрацовак і перспектыўных напрамкаў развіцця галіны. Выстава прапануе мэблю для дома: спальныя гарнітуры, наборы для кухні, дзіцячых памяшканняў. Шмат цікавага знойдуць тут і тыя, каго хвалююць сучасныя распрацоўкі для офісаў, мэбля для дачнага дома, кафэ, рэстаранаў, казіно, гандлёвых дамоў. Вытворцы мэблі выберуць новыя матэрыялы, фурнітуру і разнастайныя камплектуючыя.

Арганізатары паралельнага паказу дзвюх выстаў мелі рацыю, бо менавіта дызайн уплывае на прадукцыю вытворцаў мэблі, вызначае ўзровень мэблевага стылю. Акрамя гэтага сучасны дызайн садзейнічае стварэнню інтэр'ера, у якім задзейнічаны святлотэхнічная, аўдыё- і відэатэхніка, люстры і посуд, вырабы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Выставы зацікавяць не толькі вытворцаў, а і спажыўцоў. Тут яны маюць магчымасць атрымаць уяўленне аб найноўшых тэндэнцыях мэблевай моды, зарыентавацца ў кошце, дамовіцца аб продажы і нават набыць выставачны экземпляр.

НА ЗДЫМКАХ: мэбля на любы густ.

Тэкст і фота Яўгена КАЗЮЛІ.

падрабязнасці

У "ШЫНКУ НА ПАРКАВАЙ"

Незвычайная акцыя прайшла ў абноўленым "Шынку на Паркавай", размешчаным у Мінску па праспекце Машэрава.

На вачах у яе ўдзельнікаў і гасцей рэстарана была прыгатавана на вялікім мангале каўбаса па-сялянску дваццаціметровай даўжыні. Яе мог пакаштаваць кожны жадаючы. Удзельнікам падзеі была прадстаўлена вялікая забаўляльная праграма.

Акцыя была арганізавана ў рамках Дзён славянскай кухні XIX стагоддзя, што праводзіліся ў "Шынку на Паркавай". Тут прапаноўвалі гурманам унікальныя стравы, адроджаныя па рэцэптах з даўнейшых кулінарных кніг. Ва ўтульнай абстаноўцы можна было паесці бліноў з ікрой па-царску і вядомай "Шопскай салаты", супу з белымі грыбамі і сапраўднай юшкі з судака, халадца, страў, запечаных на мангале.

Фота Наталлі АБЛАЖЭЙ, БелТА.

бізнес-клуб

ГАНДЛЁВЫ ДОМ НА УКРАІНЕ

У пачатку кастрычніка ў Кіеўскай гандлёва-прамысловай палаце адбылася прэзентацыя беларуска-ўкраінскага сумеснага прадпрыемства ЗАТ "Гандлёвы дом "УкрГласБел", якое з'яўляецца дыстрыб'ютарскім цэнтрам беларускага завода ААТ "Гомельшкло" на Украіне. З украінскага боку сузаснавальнікам прадпрыемства выступіла ААА "Еўрастандарт, ЛТД".

Стварэнне Гандлёвага дома — упэўнены крок да пашырэння гандлёвай сеткі па рэалізацы прадукцыі нашых таваравытворцаў.

Сёння прадукцыя ААТ "Гомельшкло", маючы высокую якасць пры канкурэнтаздольным кошце, карыстаецца вялікім попытам ва ўкраінскіх пакупнікоў, і ўжо больш як 60 украінскіх прадпрыемстваў гатовы яе набываць. Гандлёвы дом дапаможа таксама ўпарадкаваць рынак збыту і спросціць механізм паступлення прадукцыі з завода.

У прэзентацыі "Гандлёвага дома" прынялі ўдзел пасол Беларусі ва Украіне Валянцін Вялічко, першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Аляксандр Бяляеў, а таксама генеральны дырэктар ААТ "Гомельшкло" Юрый Іўлеў.

Канстанцін СЕЛЬСКІ.

аспект праблемы

ЦІ ТРЭБА РАТАВАЦЬ БАЛОТЫ?

На балоце Ельня, якое знаходзіцца ў Міёрскім і Шаркоўшчынскім раёнах Віцебскай вобласці, пачалі працаваць меліяратары. Работы вядуцца пад наглядам грамадскай арганізацыі "Ахова птушак Беларусі" і раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. Меліяратары назаўсёды перакрыюць каналы і канавы, выкапаныя ў мінулым стагоддзі яшчэ да арганізацыі тут рэспубліканскага заказніка "Ельня".

Ельня плошчай 232 квадратныя метры — адно з найбуйнейшых у Еўропе верхавых балот. Яно славіцца журавінамі, месцазнаходжаннем вельмі рэдкіх птушак, такіх, як сокалдзербнік, чорнаваллёвая гагара, залацісты сявец, белая курапатка. Ідучы па балоце, нібы вандруеш па старонках "Чырвонай кнігі": карлікавая бярозка, серабрыстая чайка, жураўлі, шэры саракапут.

Балотны комплекс "Ельня" не толькі гідралагічны заказнік, але і адна з 20 ключавых арніталагічных тэрыторый Беларусі (на балотных азёрах у час міграцый спыняюцца на адпачынак тысячныя чароды гусей і журавоў, у тым ліку і гусь-піскулька — від, які знаходзіцца на мяжы знікнення). Заказнік "Ельня" хутка павінен атрымаць міжнародны статус Рамсарскай тэрыторыі. Усе цяперашнія экалагічныя праблемы заказніка, як і многіх іншых прыродных тэрыторый, звязаны з наступствамі некалі бяздумна праведзенай меліярацыі. Верхавыя балоты жывяцца, як правіла, выключна ападкамі. Некалі маладаступная тэрыторыя, якая служыла прыстанішчам многім рэдкім відам жывёл і раслін, цяпер перасыхае летам і стала лёгкадаступнай для шматлікіх паляўнічых, рыбаловаў і пажаранебяспечнай, асабліва ў засушлівыя гады. Напрыклад, толькі ў 1999 годзе выгарэла каля 50 квадратных кіламетраў балотнага масіву. Пажары паўтараюцца амаль штогод.

У тым жа 1999 годзе па ініцыятыве Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь брытанскае Каралеўскае таварыства аховы птушак выдзеліла АПБ грант для выпрацоўкі рэкамендацый па выратаванні балот. Пасля правядзення дэталёвай экалагічнай экспертызы было прапанавана з дапамогай спецыяльных дамб перакрыць 21 канаву, што ўразаюцца на тэрыторыю балота. Работы па будаўніцтве дамб пачаліся толькі ў 2002 годзе і на сённяшні дзень амаль усе закончаны. У выніку перакрыцця асушальных канаваў спыніцца адток дэфіцытнай вады, а гідралагічны рэжым балота наблізіцца да прыроднага.

Спонсарамі праекта выступілі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і Міністэрства замежных спраў Нідэрландаў (DGIS). Інжынерны праект рэабілітацыі балота распрацаваны спецыялістамі РУП "Белгіправодгас", непасрэдным выканаўцам праекта з'яўляецца Язненскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм. Адміністраванне праекта ажыццяўляецца Праграмай развіцця ААН і грамадскай арганізацыяй "Ахова птушак Беларусі" (АПБ). Навуковую падтрымку на ўсіх стадыях праекта ажыццяўляюць спецыялісты з Інстытута заалогіі НАНБ і АПБ.

Найбольш блізкая і важная задача, якая будзе вырашана ў выніку праекта, — поўнае спыненне пажараў на балоце Ельня. У будучыні чакаецца паступовае аднаўленне расліннага свету заказніка. Колькі для гэтага спатрэбіцца гадоў, пакажа час — выпраўляць памылкі заўсёды складаней, чым іх чыніць, але самае галоўнае, першы крок зроблены і яшчэ ёсць магчымасць выратаваць становішча...

Сяргей ЗУЁНАК.

гасцёўня

КАТАЙЦЕСЯ НА ЗДАРОЎЕ!

У цудоўных сучасных лядовых палацаў, якія з'явіліся за апошнія тры гады ў сталіцы і абласных гарадах, ёсць як стараннікі, так і праціўнікі. Адны не нарадуюцца магчымасці пакатацца на выдатным лядовым полі на каньках, другія – абураюцца: маўляў, нядбайна расходуюцца дзяржаўныя грошы. А ці патрэбны гэтыя палацы краіне, якая мае нямала эканамічных праблем? З гэтым пытаннем звярнулася да дырэктара сталічнага Лядовага палаца Алега КУРЧЭЎСКАГА. Ён ужо два з паловай гады кіруе мінскім Лядовым палацам. Мае шмат падзяк і дыпломаў за выдатную арганізацыю розных спаборніцтваў, у тым ліку і еўрапейскага ўзроўню. Гаспадарнік. Прагматык. Стараннік здаровага ладу жыцця. У маладосці захапляўся пажарна-прыкладным відам спорту. Працоўную біяграфію пачынаў слесарам, затым працаваў і вучыўся: політэхнічны інстытут, інстытут народнай гаспадаркі, Акадэмія кіравання. Пад яго кіраўніцтвам Лядовы палац стаў прывабным месцам адпачынку моладзі.

— Алег Паўлавіч, якія аргументы на карысць палацаў вы можаце прывесці скептыкам?

— Лічу, што палацы ўзводзяцца на карысць народа: каб людзі больш займаліся спортам, менш хварэлі. А чаму ніхто не абураецца, калі з'яўляюцца новыя рэстараны, дзе распіваюцца спіртныя напоі? Лічу, што нашу моладзь трэба ўсімі сродкамі прыцягваць да здаровага ладу жыцця. Вядома, на будаўніцтва палацаў патрачаны немалыя грошы, але цяпер яны знаходзяцца на гаспадарчым разліку і не з'яўляюцца цяжарам для дзяржавы. А карысць, якую яны прыносяць, немагчыма пераацаніць. Калі падлічыць, колькі дзяржава страчвае з-за цягі моладзі да алкаголю і наркотыкаў, то затраты на ўзвядзенне спартыўных і культурных збудаванняў будуць мізэрнымі.

— Хто наведвае палац?

— У буднія дні ў нас кожны дзень трэніруецца мінская хакейная каманда "Керамін". Працуе "Школа фігурнага катання", у якой займаецца ў сярэднім 240 дзяцей. І хоць заняткі платныя, яны даступныя: абанемент каштуе 13 тысяч рублёў у месяц. Па суботах і нядзелях праходзяць масавыя катанні на каньках. У іх прымаюць удзел каля 3 тысяч чалавек. Жадаючых трапіць на сеансы катання нямала. У нас працуе пракат канькоў, ёсць буфет, дзе можна выпіць соку, кавы. Наогул, лядовае поле занята з 7.30 да 23 гадзін кожны дзень.

— Ці дорага каштуе пракат канькоў?

— Гэта залежыць ад якасці канькоў, г.зн. ад фірмы-вытворцы. У сярэднім каля 2 тысяч рублёў за канькі плюс 1 900 рублёў — сеанс. За 3–4 тысячы чалавек можа прыемна адпачыць: пакатацца на каньках, паслухаць музыку.

— Якога ўзросту прыходзяць людзі?

— Рознага. Хто можа стаяць на каньках, той і прыходзіць.

— Ці праводзяцца якія-небудзь мерапрыемствы акрамя спартыўных?

— Каб працаваць у гаспадарчых разліковых умовах, трэба праводзіць розныя мерапрыемствы, каб палац не пуставаў, таму што неабходна аплачваць камунальныя паслугі, выдаваць зарплату персаналу, выдзяляць сродкі на развіццё. Кожны кіраўнік сёння павінен думаць аб рэнтабельнасці прадпрыемства, таму праводзім не толькі спартыўныя мерапрыемствы, але і культурныя. Мы супрацоўнічаем з многімі фірмамі, якія займаюцца шоу-бізнесам. У прыватнасці, "Клас-клуб" арганізоўвае канцэрты папулярных артыстаў. Напрыклад, у зале Лядовага палаца выступала вядомая расійская эстрадная спявачка "Земфира" і іншыя артысты. Вельмі цікавае мерапрыемства для дзяцей было арганізавана імі на Новы год. Выступалі вядучыя фігурысты, вядома, былі Дзед Мароз і Снягурка. Навагодняе прадстаўленне наведалі каля 24 тысяч дзяцей. У нашым палацы праходзяць таксама начныя дыскатэкі — маладзёжныя і для больш сталага ўзросту — "для тых, хто малады душой". Стараемся, каб кожны метр палаца быў скарыстаны.

— А вы самі на каньках катаецеся?

— Катаюся. У сераду мы адвялі пэўны час для нашых супрацоўнікаў, каб і яны маглі пакатацца. Многія гэтым карыстаюцца. Хто не ўмеў — навучыўся.

Ёсць у нас яшчэ і трэнажорныя залы, у якіх займаюцца "фігурысты" і жанчыны, якія наведваюць секцыю аэробікі.

— Ці ёсць яшчэ нейкія нерэалізаваныя праекты?

— Ёсць мара арганізаваць начную дыскатэку на каньках.

— Хай больш моладзі прыходзіць да вас "на аганёк"!

Таццяна КУВАРЫНА.

НА ЗДЫМКАХ: Алег КУРЧЭЎСКІ; будынак мінскага Лядовага палаца.

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

дыпкур'ер

ІНІЦЫЯТЫВЫ БЕЛАРУСІ ПРЫНЯТЫ ДА РАЗГЛЯДУ

Дэлегацыя Рэспублікі Беларусь працягвае ўдзел у рабоце 57-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Прадстаўнік беларускай дэлегацыі прыняў удзел у агульнай дыскусіі па пунктах парадку дня Камітэта па міжнароднай бяспецы і раззбраенні (Першага камітэта).

У выступленні прадстаўніка беларускай дэлегацыі была выкладзена пазіцыя Беларусі па пытаннях міжнароднай бяспекі і раззбраення. Было падкрэслена, што рэспубліка праводзіць адказную і паслядоўную палітыку, накіраваную на выкананне сваіх міжнародных абавязацельстваў па ўсіх міжнародных дагаворах і пагадненнях у сферы міжнароднай бяспекі і раззбраення, у тым ліку па Дагаворы аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі, Дагаворы аб скарачэнні і абмежаванні наступальных узбраенняў, Дагаворы аб звычайных узброеных сілах у Еўропе, Дагаворы аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай дальнасці, Канвенцыі па забароне біялагічнай і таксічнай зброі і Канвенцыі па забароне хімічнай зброі. Пацвярджэннем паслядоўнасці нашай палітыкі стала таксама здача дэпазітарыю Рэспублікай Беларусь у 2001 годзе інструментаў ратыфікацыі Дагавора па адкрытым небе.

Беларусь надае асобае значэнне развіццю двухбаковых мер умацавання даверу, разглядае гэты накірунак у якасці аднаго з прыярытэтаў сваёй знешняй палітыкі і падтрымлівае дыялог са сваімі суседзямі па гэтых і іншых канкрэтных праблемах рэгіянальнай бяспекі.

Першы камітэт прыступіў да разгляду асобных пунктаў парадку дня па пытаннях міжнароднай бяспекі, раззбраення і нераспаўсюджвання, уключаючы праект рэзалюцыі "Забарона распрацоўкі і вытворчасці новых відаў зброі масавага знішчэння і новых сістэм такой зброі", унесеных дэлегацыяй Рэспублікі Беларусь.

Тэкст выступлення прадстаўніка беларускай дэлегацыі размешчаны на сайце МЗС (www.mfa.gov.by).

ВІЗІТ ДЭЛЕГАЦЫІ НАРОДНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БАЛГАРЫІ

Беларусь наведала парламенцкая дэлегацыя Балгарыі, якую ўзначаліў намеснік старшыні Народнага сходу Балгарыі акадэмік Благавест Сендаў. У склад дэлегацыі ўвайшлі дэпутаты ўсіх фракцый парламента.

Праграма візіту прадугледжвала правядзенне сустрэч са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Вайтовічам, старшынёй Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вадзімам Паповым, кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уралам Латыпавым, міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь Міхаілам Хвастовым, прэзідэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаілам Мясніковічам.

У Нацыянальнай акадэміі навук адбылося падпісанне пагаднення аб супрацоўніцтве паміж акадэміямі навук абедзвюх краін. Вядомы балгарскі палітык і вучоны выступіў з лекцыяй у інстытуце матэматыкі, правёў сустрэчы з вядучымі беларускімі матэматыкамі.

Госці з Балгарыі наведалі мемарыяльны комплекс "Хатынь", Музей Вялікай Айчыннай вайны, азнаёміліся з беларускай сталіцай.

Падводзячы вынікі візіту, Б.Сендаў адзначыў, што ён стане важным крокам у далейшым развіцці і замацаванні адносін паміж парламентамі абедзвюх краін, паслужыць палітычным штуршком для актывізацыі супрацоўніцтва паміж краінамі ў гандлёва-эканамічнай сферы. Б.Сендаў падкрэсліў, што парламент Балгарыі гатовы аказаць садзейнічанне ў атрыманні Рэспублікай Беларусь статуса назіральніка ў Арганізацыі чарнаморскага эканамічнага супрацоўніцтва.

НЯМЕЦКІХ ДЫПЛАМАТАЎ ЦІКАВЯЦЬ БЕЛАРУСКІЯ СМІ

У знешнепалітычным ведамстве Беларусі адбылася сустрэча начальніка ўпраўлення інфармацыі – прэс-сакратара МЗС Паўла Латушкі з начальнікам упраўлення Федэральнага ведамства друку і інфармацыі Германіі Вольфгангам Брэтам. У сустрэчы прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол ФРГ у Беларусі Хельмут Фрык.

У ходзе сустрэчы былі абмеркаваны пытанні ўзаемадзеяння і магчымыя накірункі супрацоўніцтва паміж знешнепалітычным ведамствам Беларусі і Федэральным ведамствам друку і інфармацыі Германіі ў інфармацыйнай сферы. Адбыўся абмен падыходамі да асвятлення маючага адбыцца ў Беларусі ў бягучым годзе VI Мінскага форуму, які будзе прысвечаны беларуска-германскім адносінам.

У час знаходжання ў Мінску Вольфганг Брэт правёў таксама сустрэчы з кіраўніцтвам Белтэлерадыёкампаніі і газеты "Советская Белоруссия".

Прэс-служба МЗС.

міні-футбол

ПЕРАМАГЛІ З ЛІКАМ 14:2

Фота БелТА.

Беларуская зборная па міні-футболе сярод спартсменаў са слабым зрокам заваявала "золата" на чэмпіянаце свету ў Мілане.

Юнакі паўтарылі свой чатырохгадовы поспех у Бразіліі, абыграўшы ў фінале расіян — 14:2 (!). Лепшым варатаром турніру стаў наш Дзмітрый Соўпель. Нягледзячы на фінансавыя праблемы, хлопцы даказалі, што за прэстыж і гонар нацыі варта так гуляць.

Міхаіл МАЗАКОЎ.

свой шлях

СКАРБАШУКАЛЬНІКІ БЕЛАРУСАЗНАЎСТВА

У беларускага літаратуразнаўства складаны шлях. Трагічная гісторыя нашай краіны не спрыяла захаванню творчай спадчыны. І кафедра гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта БДУ асобна існуе толькі дзесяць гадоў. Але за гэты час яна паспела стаць адным з важных цэнтраў даследчыцкай працы, зрабіла вялікі крок у даследаванні беларускай літаратуры.

Сёння супрацоўнікі кафедры выкладаюць гісторыю беларускай літаратуры XI–XX стагоддзяў. Спецыялісты кафедры чытаюць курсы: "Гісторыя беларускай літаратуры XI–XIV стагоддзяў", "Гісторыя беларускай літаратуры XVI–XVII стагоддзяў" (дацэнт С.Кавалёў, Т.Казакова, І.Кароткі) і "Гісторыя беларускай літаратуры другой паловы XX стагоддзя" (дацэнт І.Багдановіч, Л.Тарасюк, М.Хаўстовіч, выкладчык І.Запрудскі).

Асноўныя напрамкі працы кафедры — падрыхтоўка высокакваліфікаваных філолагаў–літаратуразнаўцаў, гісторыкаў беларускай літаратуры; даследаванне літаратурнага працэсу XI–XIX стагоддзяў на Беларусі; падрыхтоўка і выданне мастацкіх тэкстаў літаратуры мінулага, падручнікаў, дапаможнікаў, хрэстаматый для ВНУ і школы.

Супрацоўнікі кафедры не толькі даследуюць творы шматмоўнай літаратуры Беларусі XI–XIX стагоддзяў, але і перакладаюць на сучасную беларускую са старабеларускай, польскай, лацінскай моў.

На думку загадчыка і супрацоўнікаў кафедры, лепшыя даследчыцкія працы неабходна перыядычна выдаваць у выглядзе асобных зборнікаў. Гэта істотна дапаможа тым, хто будзе працягваць вывучэнне літаратуры. У 2001 годзе выйшаў першы такі навуковы зборнік "Працы кафедры літаратуры БДУ" накладам 100 асобнікаў. Туды ўвайшлі матэрыялы першых навуковых чытанняў кафедры гісторыі беларускай літаратуры "Беларуская літаратура XI–XIX стагоддзяў: паэтыка — традыцыі — кантэкст".

У 2002 годзе былі выдадзены яшчэ два зборнікі накладам 50 і 100 асобнікаў. У іх сабраны як вынікі даследаванняў супрацоўнікаў кафедры, так і цікавыя артыкулы аспірантаў, магістрантаў і гасцей семінараў.

Акрамя навуковых матэрыялаў, у двух апошніх зборніках змяшчаліся "Дадаткі", дзе былі надрукаваны пераклады твораў беларускіх пісьменнікаў розных часоў з польскай, старославянскай і лацінскай моў (Рыгора Цамблака, Яна Ходзькі, А.Вярыгі–Дарэўскага і іншых). Зборнікі мэтазгодна выкарыстоўваць у якасці вучэбных дапаможнікаў на практычных занятках і семінарах. Пераклады, змешчаныя ў "Дадатках", незаменныя пры вывучэнні творчасці некаторых аўтараў.

Значная частка накладу (20 асобнікаў) трапляе ў Нацыянальную бібліятэку, у тым ліку ў абменны фонд. Адтуль — у бібліятэкі Расіі, Польшчы, Украіны, ЗША і іншыя. Такім чынам зборнікі становяцца даступнымі для беларускай дыяспары. Можна знайсці "Працы кафедры..." таксама ў бібліятэцы Акадэміі навук і, зразумела, у бібліятэцы самога Белдзяржуніверсітэта.

Чацвёрты выпуск "Прац кафедры..." запланавана выдаць да дзесяцігоддзя яе стварэння (красавік наступнага года).

Можна з упэўненасцю сказаць, што юбілейны выпуск будзе асабліва цікавым і змястоўным.

Хочацца спадзявацца таксама, што ён выйдзе большым накладам, здавальняючы патрэбы ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй і развіццём нацыянальнай літаратуры, а кафедра пачне другое дзесяцігоддзе свайго існавання з гатоўнасцю да новых пошукаў і адкрыццяў.

Ігар СІРОТКІН, Алеся МАХАВІЧЭНКА.

спадчына

Фота БелТА.

УРОКІ Ў МУЗЕІ

Урокі гісторыі ў Кнотаўшчынскай сельскай школе Стаўбцоўскага раёна часта праходзяць у краязнаўчым музеі, які створаны тут сваімі сіламі. Добрым дапаўненнем да матэрыяла, змешчанага ў падручніку, становяцца на ўроках гісторыі экспанаты музея, сабраныя ў час экспедыцый па навакольных вёсках.

НА ЗДЫМКУ: урок гісторыі ў школьным музеі праводзіць выкладчык Людміла СТАНЬКО.

выставы

"ПОКЛІЧ" ЗАПРАШАЕ

У верасні ў Музеі беларускай літаратуры, што ў Траецкім прадмесці, пачала працаваць новая выстава "Покліч". У экспазіцыі прадстаўлены дакументы пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў Беларусі пачатку XX стагоддзя.

Стваральнікі выставы скарысталі даволі нетрадыцыйны падыход да арганізацыі і афармлення пакояў музея. Фотаздымкі, дакументы, рэчы размешчаны не ў храналагічным парадку, а, на першы погляд, зусім выпадкова: першае выданне "Безназоўнага", нумары часопісаў тых гадоў, рэчы, сярод якіх скрыпкі, люлькі, нават шапкі Янкі Купалы, Цішкі Гартнага, шмат розных дакументаў, якія даюць уяўленне пра тую эпоху.

Адэліна ПАПОВА,
студэнтка журфака.

жыццёвыя сюжэты

РАБІНЗОН З ЛЮБАНІ

Ну не склалася ў чалавека жыццё, не склалася. Спачатку на сыраробчым заводзе, дзе ён адпрацаваў шаснаццаць гадоў, здарыўся канфлікт з дырэктарам. Той аказаўся злапамятным і ў рэшце рэшт пазбавіўся ад упартага падначаленага, скараціўшы яго пасаду. Потым жонка, з якой пражылі разам больш за чвэрць стагоддзя, нарадзілі і выгадавалі пяцёра дзяцей, пайшла налева. Ды з кім! З яго ж сябрам! Ітады Уладзімір Краснабарод вырашыў пакінуць дом і пасяліцца ў лесе.

Праўда, атрымалася гэта не адразу, а неяк паступова. Кіламетры за тры ад Любані ёсць канал. Ён рэгулюе ўзровень вады ў сажалках мясцовага рыбгаса. У тым канале лавіліся і карпы, і ліні, і ляшчы, і карасі. Ды і іншай рыбы ўдосталь. Вось і зачасціў сюды Уладзімір Яўгенавіч, каб развеяць на прыродзе свае цяжкія думкі, каб вылечыцца ад скрухі і крыўды.

— Клюе лепш на досвітку, — расказвае ён, нервова пашчыпваючы пальцамі няголены падбародак. — Значыць, трэба ўставаць рана ды перціся за блізкі свет. Нязручна! І я надумаў заставацца тут на ноч. А што?! Ад працы мяне вызвалілі, ды ў кватэры быццам бы нічога ўжо не трымае. Застаўся раз, застаўся другі. Так і прыжыўся.

Першым чынам Краснабарод змайстраваў сабе ў зацішным кутку будан. Аднак той будан адразу ж аблюбавала тутэйшая моладзь для забаў.

І тады Уладзімір Яўгенавіч узяўся будаваць хаціну з бярвенняў. Каб была мацнейшай, каб замыкалася, калі гаспадар у адлучцы. Чаго-чаго, а сухастою ў лесе хапала. Побач паставіў павець, столік і лаўку. А крыху воддаль нават пограб выкапаў. Нетаропка. Паступова. Глядзіш, за пяць гадоў атабарыўся, можна сказаць, капітальна.

Зрэшты, гараджане пры ўпамінанні прозвішча "Краснабарод" круцяць пальцам ля скроні. Маўляў, дах у небаракі паехаў. Хіба ж нармальны чалавек, маючы чатырохпакаёвую кватэру, будзе бамжаваць у бліжэйшым ельніку?! Размяняў бы ў крайнім выпадку свае харомы ды жыў бы па-людску!

Але Любань — гарадок невялікі. І здзейсніць такі размен у ім амаль немагчыма. Падзяліць жа жылплошчу і потым кожны дзень сутыкацца на агульнай кухні з нялюбай жонкай — перспектыва не надта прыемная.

— Я ўжо лепш тут... — уздыхае Уладзімір Яўгенавіч.

Свой сціплы побыт Краснабарод арганізаваў, як умеў. У хаціне дзве ляжанкі, столік, печ, просты посуд. За метраў пяць на сасне асколак люстэрка і рукамыйнік: перавернутая пластыкавая пляшка з адрэзаным дном і коркам замест краніка. Побач гэты дзіўны лясны жыхар збіраецца нават душ абсталяваць.

— Зімой не холадна? Вельмі ж сцены тонкія... — скептычна азіраю хаціну.

— Ды не, — паціскае плячыма субяседнік. — Дроў навокал шмат. Раз так напаліў у печы, што аж тэрмометр пакаёвы лопнуў! Шкалы не хапіла!

— А не страшна, — цікаўлюся, — аднаму?

— Не, — адказвае. — Хіба што зімой, калі воўчыя вяселлі пачынаюцца. Тады шэрыя дзесьці непадалёк выюць ды шастаюць. Аднак на ўласныя вочы гэтую звяругу бачыў пакуль толькі аднойчы. Ды і не адзін я. Кот у мяне ёсць. Шурыкам заву.

У пацвярджэнне сказанага Шурык, соладка пацягваючыся, вылазіць з кустоў, нетаропка падыходзіць да нас, асцярожна абнюхвае маю калашыну і потым даверліва ўскоквае мне на калені. Кот — звычайны спадарожнік адзіноты...

— А харчуецеся вы чым? — пытаюся, пагладжваючы худога мурлыку.

— Ды па-ўсякаму... — суразмоўца на хвілінку задумваецца. — Восенню на калгасных палетках пасля копкі столькі бульбы застаецца!.. Сюды зноў жа розны люд адпачываць прыязджае. Каму дроўцаў паднясу, у каго за вогнішчам паназіраю. За гэта і частуюць. Раз нейкі мужык нават долар падарыў!

Зарабляе Краснабарод і іншымі спосабамі. Збірае і здае грыбы, ягады, лекавыя травы. Да пенсіі яму яшчэ далекавата! Ды ці будзе тая пенсія ў беспрацоўнага?!

— Акрамя таго, вару сабе варэнне, назапашваю бярозавы сок, — працягвае Уладзімір Яўгенавіч. — На беразе канала агародзік ускапаў. Памідорчыкі, агурочкі... А якая капуста мінулым летам расла! Рыбу, канешне ж, лаўлю. Але яе цяпер мала — "павукамі" павычэрпвалі...

— А дзеці, дзеці як ставяцца да вашай "рабінзанады"? — задаю пытанне, частуючы лясного жыхара цыгарэтай.

— А што дзеці? — прагна зацягваецца той. — Дзеці ўжо дарослыя. Малодшы два дзесяткі размяняў. У іх сваё жыццё. Ну, праўда, калі-нікалі наведваюцца.

Ён бярэ на рукі ката і, развітаўшыся, невысокі і лядашчы, брыдзе да ўласнай хаціны. Да свайго дома...

Тэкст і фота Сяргея КВІТКЕВІЧА.

шматгалоссе

"РУСІ" 10 ГАДОЎ

Мінскае гарадское таварыства рускай культуры "Русь" святкуе 10-годдзе. З гэтай нагоды ў Доме ветэранаў адбыўся юбілейны вечар, на якім выступіў рускі хор імя Аляксандры Нікіцінай.

Мінскае гарадское таварыства рускай культуры "Русь" было зарэгістравана Міністэрствам Беларусі ў 1992 годзе. З часам некалькі яго аддзяленняў з'явілася і ў іншых гарадах рэспублікі. У 1995 годзе было створана рэспубліканскае таварыства з цэнтрам у Брэсце, а яшчэ праз чатыры гады ўсе гарадскія аддзяленні ў абласных цэнтрах аб'ядналіся ў рэспубліканскае таварыства "Русь" з цэнтрам у Мінску.

"Мінск—Навіны".

прапануе тбм

ТЭЛЕФОННЫ СЛОЎНІК

Вядома, што тэлефонныя службы здольныя значна аблягчыць жыццё жыхароў вялікіх гарадоў. Па тэлефоне можна заказаць піцу і таксі, білеты на цягнік, даведацца пра час і надвор'е і нават атрымаць псіхалагічную дапамогу па так званым "тэлефоне даверу". А сёння ў спісе тэлефонных паслуг, якімі карыстаюцца мінчане, з'явілася і нешта новае.

Калі набраць нумар 284-85-11, у адказ дапамогу прапаноўваюць філолагі — спецыялісты па беларускай мове. У іх можна запытацца пра ўсё: у чым розніца паміж пупышкамі, почкамі і ныркамі, як трэба пісаць: камунізму ці камунізма, як пішацца ваша прозвішча на беларускай мове... Тэлефонныя "даведнікі" не здзіўляюцца і цярпліва адказваюць на самыя розныя пытанні.

Тэлефонная служба арганізавана Таварыствам беларускай мовы з мэтай павышэння моўнай культуры нашага грамадства.

Адэліна ПАПОВА.

ЯДНАЮЦЬ СВЯТЫНІ

Дакрананне да святыні заўсёды напаўняе душу гаючай благадаццю. На жаль, так рэдка атрымліваецца ў нашым мітуслівым жыцці па-сапраўднаму малітоўна душой і сэрцам далучыцца да святыні і атрымаць тую благадаць, якую Гасподзь шчодра пасылае нам!

Вялікай міласцю Божай з'яўляецца для братчыкаў і прыхаджан Свята-Петра-Паўлаўскага сабора Мінска штогадовае летняе паломніцтва ў Віленскі Свята-Духаў манастыр да мошчаў святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія. Такое паломніцтва стала традыцыяй: Праваслаўнае Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў ладзіць яго ўжо на працягу 10 гадоў.

Сёлетнее паломніцтва было асаблівым, таму што на чале яго з афіцыйным візітам у Літоўскую епархію накіроўваўся Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі. Такі візіт адбываўся ўпершыню за час яго служэння ў сане Правячага архірэя Беларускай Праваслаўнай Царквы, а такое служэнне Мітрапаліт Філарэт вядзе ўжо 25 гадоў.

Здавалася, нішто не можа перашкодзіць умацаванню еднасці паміж праваслаўнымі Літвы і Беларусі. Але з кожным годам узнікае ўсё больш цяжкасцей, звязаных з тымі строгімі, а часам і жорсткімі патрабаваннямі, выкананне якіх неабходна для пераезду з Беларускай дзяржавы ў Літоўскую. Невядома, ці пераадолелі б беларускія паломнікі гэтыя цяжкасці, калі б на дапамогу не прыйшлі нашы літоўскія суайчыннікі. Мы вельмі ўдзячныя старшыні Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы Лявону Мурашку, які хадайнічаў за нас у самых розных літоўскіх інстанцыях і нарэшце знайшоў падтрымку ад Беларускага Пасольства ў Літве. Дзякуючы ўсім гэтым намаганням, паломніцтва ўсё ж адбылося!

Традыцыя ўшанавання святых мучанікаў Віленскіх бярэ пачатак з XIV стагддзя. У хуткім часе пасля іх пакутніцкага спачыну ў 1347 годзе пачаліся цуды і ацаленні ад іх нятленных мошчаў. І ўжо ў 1364 годзе мучанікі Антоній, Іаан і Яўстафій былі кананізаваны Канстанцінопальскім патрыярхам Філафеем. У 1374 годзе з Вільні ў Канстанцінопаль былі ўрачыста перанесены часцінкі іх святых мошчаў і размешчаны ў Канстанцінопальскім саборы Св. Сафіі для малітоўнага ўшанавання. Тады ж была складзена і царкоўная служба святым мучанікам. У 1646 годзе служба Віленскім мучанікам была надрукавана ў Маскве і ўключана ў Мінею пад 14 красавіка (с.ст.).

Пра шырокае ўшанаванне святых мучанікаў ва ўсім праваслаўным свеце сведчаць многія факты. Першыя жыццяпісы святых Антонія, Іаана і Яўстафія былі напісаны на грэчаскай мове (у Канстанцінопальскім патрыярхаце) і на славянскай мове (складзены сербскім манахам), прычым жыццяпісы ствараліся незалежна адзін ад аднаго.

Выявы святых мучанікаў разам з выявамі візантыйскіх і маскоўскіх князёў былі вытканы на вялікім сакасе (так называецца верхняе архірэйскае аблачэнне) Мітрапаліта Кіеўскага і ўсяе Русі Фоція (1408–1431).

Часцінкі святых мошчаў мучанікаў Віленскіх былі ўкладзены ў залаты крыж, падараваны Канстанцінопальскім патрыярхам Філафеем заснавальніку Троіца-Сергіевай лаўры прападобнаму Сергію Раданежскаму.

Найбольш глыбока святыя Антоній, Іаан і Яўстафій ушаноўваліся праваслаўнымі на ўсёй тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, таму што сярод нашых суайчыннікаў яны былі першымі, хто прыняў пакутніцкую смерць за Хрыста. Вядома, што дабраверны князь Канстанцін Астрожскі, адпраўляючыся на бітву ў 1514 годзе, маліўся каля мошчаў святых мучанікаў і даў абяцанне адбудаваць струхнелыя цэрквы Свята-Троіцкую і Свята-Мікалаеўскую.

У час уніі, перасцерагаючыся, каб святыя мошчы не былі адабраны уніятамі, настаяцель Свята-Духавага манастыра архімандрыт Іосіф Нелюбовіч-Тукальскі схаваў мошчы святых мучанікаў пад галоўным алтаром Свята-Духавага храма. У гэтым скляпенні святыня заставалася схаванай больш за сто пяцьдзесят гадоў.

У 1851 годзе намаганнямі Мітрапаліта Літоўскага Іосіфа (Сямашкі) скляпенне было значна пашырана і ператворана ў крыптавую царкву ў імя мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія. На ахвяраванні веруючых была зроблена новая залачоная рака, куды ў дзень памяці мучанікаў у 1852 годзе былі ўрачыста перакладзены іх святыя мошчы. У гэтай рацы святыя мошчы знаходзяцца і дагэтуль. У 1997 годзе па благаславенню Мітрапаліта Віленскага і Літоўскага Хрызастома рака з мошчамі святых мучанікаў была вынесена з крыптавай царквы і пастаўлена ў цэнтральным прыдзеле Свята-Духавага сабора для малітоўнага ўшанавання веруючымі.

Нават у савецкі час у многіх набожных сем'ях Беларусі існаваў звычай у час гавення ў Вялікі пост абавязкова пабываць у Віленскім Свята-Духавым манастыры, каб паспавядацца і прычасціцца каля мошчаў святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія.

Пасля таго як 26 ліпеня 1993 года па ініцыятыве Брацтва Трох Віленскіх Мучанікаў у Мінскі Свята-Петра-Паўлаўскі сабор былі перанесены ў іконе часцінкі святых мошчаў мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія, сувязь паміж Вільняй і Мінскам становіцца ўсё больш цеснай. На працягу ўсіх гэтых гадоў кожную сераду Брацтва служыць акафіст перад іконай сваіх нябесных апекуноў. Сіламі Брацтва было зроблена ўжо некалькі перавыданняў "Акафиста святым мученикам Виленским Антонию, Иоанну и Евстафию", гэтыя выданні (тыражом некалькі соцень штук) Брацтва штогод перадае ў дар Свята-Духаваму манастыру. Летась такое выданне было дапоўнена "Житием" і "Кратким изложением истории Виленского Свято-Духова монастыря" і надрукавана тыражом 1 000 асобнікаў. Сёлета такі ж тыраж быў зноў надрукаваны і перададзены манастыру.

На вялікі жаль, даводзіцца сведчыць, што сёння Праваслаўная Царква ў Літве апынулася ў пэўным сэнсе ізаляванай ад усяго асноўнага абшару Рускай Праваслаўнай Царквы. Асабліва адчувае на сабе гэтую ізаляванасць Свята-Духаў манастыр. Калі раней нават былі цяжкасці з размяшчэннем паломнікаў, то цяпер у манастырскую браму часцей за ўсё завітваюць альбо групы экскурсантаў, альбо проста цікаўныя прахожыя. Таму паломніцкі аўтобус з Мінска сустрэлі ў манастыры з радасцю. "Зусім іншае адчуванне ў храме, калі на службе стаяць веруючыя, — сказала ў размове з братчыкамі манахіня, рэгент манастырскага хору, — таму абавязкова прыязджайце, нягледзячы на цяжкасці і перашкоды. Мы вельмі чакаем вас".

Святочная літургія ў дзень памяці святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія 26 ліпеня ў Віленскім Свята-Духавым манастыры была надзвычай урачыстай. Яе правілі адразу два прадстаяцелі Праваслаўных Цэркваў Беларусі і Літвы – Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт і Мітрапаліт Віленскі і Літоўскі Хрызастом (на здымку). "Такога духоўнага і малітоўнага свята мы не перажывалі даўно, — адзначыў у сваёй пропаведзі Мітрапаліт Хрызастом, — і мы вельмі ўдзячныя Яго Высокапраасвяшчэнству Мітрапаліту Філарэту і беларускім паломнікам за духоўную падтрымку".

Так, манастыру сапраўды неабходна падтрымка ў цяперашні цяжкі час. І больш за ўсё — падтрымка малітоўная. Ніякія межы і ніякая дзяржаўная палітыка не павінны парушыць нашай еднасці. Мы ж маем адзіную гісторыю і адзіныя святыні!

Акрамя таго ў Вільні жыве столькі нашых суайчыннікаў, што нас звязвае не толькі гісторыя, але і сучаснасць. Год таму пры Віленскай Свята-Мікалаеўскай царкве ўтварылася суполка праваслаўных беларусаў. Яны звярнуліся да Высокапраасвяшчэннейшага Хрызастома, Мітрапаліта Віленскага і Літоўскага, з просьбай благаславіць богаслужэнне на беларускай мове. Уладыка Хрызастом даў сваё благаславенне і нават прысутнічаў, стоячы ў храме сярод веруючых, на першай беларускамоўнай літургіі, якая адбывалася ў Свята-Мікалаеўскім храме 21 ліпеня 2001 года. Пры заканчэнні літургіі Уладыка сказаў пропаведзь і заклікаў усіх веруючых імкнуцца да больш поўнага і глыбокага жыцця ў Хрысце. З таго часу літургія на беларускай мове адпраўляецца кожную суботу.

Трэба адзначыць, што ініцыятарамі ўтварэння суполкі сталі для многіх з нас знаёмыя беларусы з Мінска, якія пераехалі ў апошнія гады на сталае жыццё ў Вільню. На нашае пытанне, як усё ж такі ўзнікла такая ідэя, Таццяна Дубавец адказала: "Спачатку нас вельмі натхнілі цудоўныя пропаведзі айца Васілія (протаіерэй Васілій Навінскі — духоўны апякун суполкі). А наогул, ведаеце, можа ў вас наркаманіяй толькі палохаюць, а для нас гэта страшная рэальнасць, якая падсцерагае нашых дзяцей на кожным кроку. Іншага паратунку, як у царкве, для сваіх дзяцей мы проста не бачым".

Дзейнасць суполкі пакідае радаснае ўражанне: нарэшце Вільня перастае падзяляцца на "Вільню беларускую" і "Вільню праваслаўную". Вельмі хочацца спадзявацца, што суполка здолее адыграць гэтую важную ролю ў паяднанні нашай Вільні ў адзіную "беларускую праваслаўную Вільню".

А Лявон Мурашка, які так паспрыяў у арганізацыі нашага паломніцтва, ужо больш за 20 гадоў з'яўляецца кіраўніком хору Свята-Духавага манастыра. Гэта жывы сімвал праваслаўнай беларушчыны ў Вільні! Будучы адначасова і старшынёй Згуртавання беларускіх грамадскіх арганізацый Літвы, ён мае вялікі клопат пра дзейнасць і ўладкаванне Віленскай Беларускай гімназіі імя Ф.Скарыны. Вельмі важна, каб навучэнцы гімназіі мелі магчымасць большага кантакту з Бацькаўшчынай. І дзейсным крокам у гэтым накірунку была б арганізацыя летнікаў у Беларусі для навучэнцаў Віленскай беларускай гімназіі супольнымі намаганнямі Брацтва і Згуртавання.

Асобна хочацца завесці гаворку яшчэ пра адну віленскую святыню. Неяк усе мы ўжо змірыліся з думкай, што вярнуць гэтую святыню ва ўлонне праваслаўя немагчыма. І кожны раз, калі прыязджаем у Вільню, нам застаецца толькі, пастаяўшы каля царквы, з тугою ў сэрцы адысці. Размова ідзе пра Свята-Троіцкі сабор, заснаваны на месцы пакутніцкай смерці святых Антонія, Іаана і Яўстафія, у памяць "Троице равночисленных" мучанікаў. Паводле царкоўнага падання, корань таго дуба, на якім былі павешаны целы святых мучанікаў, знаходзіцца пад прастолам Свята-Троіцкага храма, а з самога дуба была зроблена рака, куды першапачаткова былі пакладзены іх святыя мошчы. У хуткім часе пасля пабудовы храма вакол яго ўзнік мужчынскі Свята-Троіцкі манастыр. У XVI стагоддзі ў манастыры дзейнічала Віленскае Свята-Троіцкае праваслаўнае брацтва, якое мела там сваю школу, друкарню, багадзельню. Падчас уніі манастыр быў забраны ў праваслаўных і аддадзены уніяцкаму базыльянскаму ордэну. Да 1655 года мошчы святых мучанікаў заставаліся ў Свята-Троіцкім саборы, ушаноўваліся яны таксама і уніятамі. Як вядома, на пачатку XX стагоддзя ў манастырскіх будынках размяшчалася Віленская Духоўная семінарыя, Віленская беларуская гімназія, а таксама Беларускі музей, заснаваны братамі Луцкевічамі.

Гадоў сем таму Свята-Троіцкі сабор быў перададзены ўкраінскай уніяцкай абшчыне Вільні, якая аднавіла капліцу пры саборы і адпраўляе там свае службы. Абшчына гэтая, як высветлілася, зусім невялікая. Нават на Вялікдзень збіраецца трохі больш за пятнаццаць чалавек. Сабор паранейшаму стаіць увесь у рыштаваннях, ніякія рэстаўрацыйныя работы ў ім не пачыналіся. Але з часу нашага апошняга прыезду на фасадзе сабора з'явілася новенькая шыльда з выявай Іясафата Кунцэвіча і надпісам, у якім паведамляецца, што "святы Іясафат" служыў тут на працягу некалькіх гадоў. Тут жа на фасадзе знаходзяцца дзве нішы са старажытнымі і ўжо ледзь бачнымі ад часу фрэскамі: святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія — у левай нішы, а ў правай – прападобнамучаніка Афанасія Брэсцкага, свяціцеля Макарыя, Мітрапаліта Кіеўскага і паміж імі апостала Іаана Багаслова. Як горка і балюча праваслаўнаму чалавеку бачыць на адной сцяне гэтыя выявы: дзве ў нішах — старажытныя, зусім занядбаныя, але такія дарагія для сэрца, і трэцюю — новенькую і бліскучую. Як бачым, сучасныя уніяты-ўкраінцы забыліся ці не ведаюць пра старажытную традыцыю ўшанавання беларускіх першамучанікаў.

Няўжо гэтая святыня, якая магла б стаць і аб'ектам паломніцтваў, і цэнтрам духоўнай асветы, і асяродкам пераемнасці і развіцця беларускай культурнай традыцыі ў Вільні, так і застанецца страчанай для нас назаўжды?! Вельмі хочацца спадзявацца, што па малітвах святых мучанікаў Антонія, Іаана і Яўстафія Гасподзь не пакіне святыню Сваю на занядбанне і адкрые нам шляхі яе аднаўлення дзеля праслаўлення імя Божага!

Таццяна МАТРУНЧЫК.

г.Мінск.

зваротная сувязь

АРМЕНІЯ

ВЯЛІКАЕ СВЯТА КУЛЬТУР

Адбыўся сёмы фестываль Саюза нацыянальнасцей Арменіі. Гэта музычнае свята было праведзена Саюзам нацыянальнасцей і прысвечана Дню Незалежнасці Рэспублікі Арменія.

Выканаўцам і гасцям фестывалю накіраваў сардэчнае прывітанне старшыня Саюза нацыянальных меншынстваў В.Чатоеў.

У канцэртнай праграме прымалі ўдзел прадстаўнікі адзінаццаці нацыянальных і нацыянальна-культурных арганізацый, аб'яднаных у Саюз нацыянальнасцей, тэатр песні Дома афіцэраў і дзіцячы ансамбль танцаў народаў свету "Модус" Палаца культуры Каназ.

Наша суполка таксама прымала ўдзел у гэтым свяце і прадставіла гледачам песню-гімн "А хто там ідзе?" у выкананні Алега Шамрая, народную байку "Хама" і ўрывак з паэмы Якуба Коласа "Новая зямля" ў выкананні Жанны Нікітчук.

ВОСЕНЬ У ДЗЕЮЧЫХ АСОБАХ

У памяшканні Ерэванскай агульнаадукацыйнай школы імя А.С.Пушкіна вучні суполкі "Беларусь" правялі на беларускай мове свой першы асенні баль "Залатая восень".

У праграме свята прагучала пастаноўка "Восень" па матывах твораў беларускіх паэтаў Янкі Купалы, Якуба Коласа, Максіма Танка, Артура Вольскага, Эдзі Агняцвет.

У канцэртнай праграме прынялі ўдзел: вядучая — Нара Дашан, восень — Ліля Эмінян, верасень — Арцём Марцірасян, кастрычнік — Лявон Бадалян, лістапад — Алег Шамрай, вучні — Лена Аракелян, Крысціна Марцірасян, Гаянэ Енакян.

Кіраўнік беларускага дыпрадстаўніцтва ў Рэспубліцы Арменія В.Сысоеў падзякаваў юным выканаўцам і ўручыў актыўным удзельнікам праграмы прыгожа ілюстраваныя кнігі на беларускай мове.

Валянціна ВАРАЖАН,
старшыня суполкі "Беларусь".

РАСІЯ, ІРКУЦК

«ДОБРЫ ДЗЕНЬ У ХАТУ»

У Іркуцкім музеі гісторыі адкрылася выстава "Дзень добры ў хату", якая расказвае пра жыццё беларусаў Прыбайкалля.

У матэрыялах, якія размешчаны на стэндах, расказваецца пра тое, як асталёўваліся ў Прыбайкаллі сасланыя ўдзельнікі паўстання 1863 года, пра перасяленцаў падчас Сталыпінскай рэформы, беларусаў — удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны і вядомых у нашы дні іркуцкіх беларусаў — прафесара-нейрахірурга Анатоля Рэута, былога віцэ-губернатара Уладзіміра Якавенку, гісторыю ўзнікнення і развіцця Іркуцкага таварыства беларускай культуры.

Прадметы хатняга ўжытку беларусаў, у тым ліку і прывезеныя некалі з гістарычнай радзімы, нацыянальныя касцюмы, вышытыя ў адпаведнасці з народнымі традыцыямі, — гэтыя і іншыя экспанаты выклікаюць вялікую цікавасць у наведвальнікаў.

"Саюз—Інфо".

занатоўкі даследчыка

ЛЕКАР З ГАРОДНІ

У сакавіку 1863 года Каэтан Маўлевіч, які нарадзіўся ў 1844 годзе ў Гародні ў мяшчанскай сям'і, па адукацыі фельчар, быў аддадзены на вайсковую службу ў расійскае войска ў 72-гі Тульскі пяхотны полк. 23 чэрвеня 1863 года ён здзейсніў уцёкі са сваёй службы і далучыўся да паўстанцаў.

Але 1 жніўня быў злоўлены. Таму "за знаходжанне ў шайцы мяцежнікаў, страту казённых і амуніцыйных рэчаў ды лжывыя звесткі аб сваім званні па канфірмацыі Варшаўскага каменданта" Маўлевіч быў пазбаўлены вайсковага звання і сасланы на пасяленне ў самыя аддаленыя месцы Сібіры". Табольскім загадам аб сасланых ён быў накіраваны ў Якуцкую вобласць. Прадпісаннем якуцкага губернатара ад 24 мая 1866 года ён быў пераселены ў Алёкмінскую акругу Якуцкай вобласці. У Алёкмінск ён прыбыў 12 ліпеня 1868 года і быў накіраваны ў Бердзенскае паселішча Алёкмінскай воласці, дзе першым сярод сасланых Алёкмінскай акругі пачаў займацца медыцынскай практыкай. Ён атрымліваў гадавыя білеты дзеля працы на залатых капальнях і да восені 1872 года служыў фельчарам на капальнях І.Базілеўскага Алёкмінскай горнай акругі. Па запыце Якуцкай адміністрацыі генерал-губернатар Усходняй Сібіры 4 верасня 1872 года дазволіў яму медыцынскую практыку ў горадзе Алёкмінску і Алёкмінскай воласці. У сваёй адпісцы алёкмінскі акруговы спраўнік адзначаў 20 чэрвеня 1874 года "ягоную карыснасць у акрузе і ў асаблівасці ў горадзе".

У 1873 годзе Маўлевіч "уступіў у першы законны шлюб" з дачкой селяніна Табагінскай станцыі Іркуцкага тракта Марыяй Бутырынскай, якая нарадзіла яму трох дачок. У 1875 годзе па пашпарце Маўлевіч пераехаў у Якуцк. Загадам Якуцкага абласнога праўлення ад 12 лютага 1879 года Каэтан быў прылічаны да Якуцкай мяшчанскай грамады. Згодна з Маніфестам ад 15 мая 1883 года, яму было дазволена вольна выбіраць сабе месца жыхарства ў "межах еўрапейскай і азіяцкай Расіі за выключэннем сталіц і сталічных губерняў". Таму 25 кастрычніка 1886 года Маўлевіч падаў у Якуцкае акруговае праўленне прашэнне на імя цара, каб яму дазволілі выезд з Якуцка. Пэўна дазвол ён атрымаў, бо больш у якуцкіх архівах ягонае імя не згадваецца.

Алесь БАРКОЎСКІ.

беларусы ў свеце

"СВІТАНАК" ВА УЗБЕКІСТАНЕ

Спакон веку сярэднеазіяцкі рэгіён насяляла вялікая колькасць розных этнасаў. Гэтыя абставіны вызначылі поліэтнічнасць незалежнага Узбекістана ў нашы дні. На тэрыторыі Рэспублікі Узбекістан пражываюць прадстаўнікі больш як 100 нацыянальнасцей. Многія з іх у розны час і па розных прычынах апынуліся тут, але захоўваюць у сем'ях назапашаныя тысячагоддзямі культурныя каштоўнасці і традыцыі свайго народа.

Як фарміруецца нацыянальная палітыка, ажыццяўляецца культура міжнацыянальных адносін у Рэспубліцы Узбекістан? З першых дзён незалежнасці гэта праблема разглядалася ў непарыўным адзінстве з пытаннямі палітычнага, эканамічнага і сацыяльнага развіцця. У прынятай у 1992 годзе Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан, у артыкуле 18, запісана: "Усе грамадзяне Рэспублікі Узбекістан маюць аднолькавыя правы і свабоды і роўныя перад законам, нягледзячы на пол, расу, нацыянальнасць, мову, рэлігію, сацыяльнае паходжанне, перакананні, уласнае і грамадскае становішча". Грамадзянская і нацыянальная згода — важны вынік больш чым дзесяцігадовага развіцця краіны.

У правядзенні нацыянальнай палітыкі ва Узбекістане важнае месца адводзіцца як дзяржаўным структурам, так і грамадскім аб'яднанням, у прыватнасці, нацыянальна-культурным цэнтрам. Цяпер іх у рэспубліцы налічваецца больш за 100. Сярод грамадскіх аб'яднанняў — Беларускі культурны цэнтр "Світанак", створаны ў 1993 годзе. Ён быў зарэгістраваны Хакіміятам горада Ташкента ў кастрычніку 1993 года.

Першым старшынёй БКЦ "Світанак" быў Кірыл Гром, затым з 1996 года — Сяргей Пратасевіч. З 2001 года цэнтр узначальвае Лілія Белазёрава. Усе яны ўнеслі значны ўклад у дзейнасць цэнтра.

У статуце БКЦ адзначаецца, што цэнтр — дабравольнае самадзейнае аб'яднанне беларусаў, якія пражываюць у Рэспубліцы Узбекістан, галоўнай мэтай якога з'яўляецца рэалізацыя праграм, звязаных з вывучэннем і прапагандай мовы, гістарычных звычаяў і традыцый, культуры беларускага народа, замацаванне сувязей і дружбы паміж узбекскім і беларускім народамі.

На 1 студзеня 1999 года, па статыстычных даных, насельніцтва Узбекістана налічвала 24 135 559 чалавек, з іх беларусаў — 24 064. Большасць з іх пражывае ў гарадах — 19 785 чалавек, у сельскіх мясцовасцях — усяго 4 279 чалавек. Цяжкасці ў рабоце з дыяспарай узнікаюць з-за адсутнасці кампактнага месца пражывання беларусаў. З другога боку, магчыма, гэтыя абставіны ў нейкай ступені садзейнічаюць хутчэйшай адаптацыі беларусаў да ўмоў жыцця ў краіне.

Беларускі нацыянальна-культурны цэнтр пакуль створаны толькі ў Ташкенце. У абласцях беларусы аб'ядноўваюцца ў культурных цэнтрах разам з іншымі этнасамі. Напрыклад, у Ферганскай вобласці існуе адзіны "Славянскі цэнтр".

Працуюць у БКЦ "Світанак" сапраўдныя энтузіясты. Гэта старшыня цэнтра "Світанак" Л.Белазёрава, мастацкі кіраўнік В.Цітова, актывісты В.Сулейкін, М.Шатрай, Л.Беражнева, Н.Ягорава, В.Туранава, Н.Юшкевіч, М.Ратнікаў, Э.Кухарук, Р.Шубская, А.Цэуля, Я.Торап, Н.Шубнікава, Т. Катомцава і іншыя.

Старшыня цэнтра Лілія Белазёрава і Валянціна Цітова збіраюць банк даных аб беларусах, якія пражывалі і пражываюць на тэрыторыі Узбекістана. Толькі за 2001-2002 гады выяўлена 200 новых імён. Некаторыя з іх — яркія асобы, якія пакінулі добрую памяць пра сябе.

Такім быў Арнольд Ган. У 1948 годзе ён паступіў у Маскоўскі інстытут дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а пазней быў пераведзены ў Ленінградскае вышэйшае мастацка-прыкладное вучылішча імя В.Мухінай, якое закончыў у 1955 годзе. Вучыўся майстэрству ў вядомых мастакоў Фаворскага і Кашына. Меў беларускія карані ад дзеда Віктара Гана. Бацька Арнольда Гана — Павел Віктаравіч (1894-1967) быў вядомым мастаком, да рэвалюцыі вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і архітэктуры, быў вучнем Каровіна і Васняцова. У Ташкенце выкладаў у Рэспубліканскім мастацкім вучылішчы імя П.Бянькова і падрыхтаваў цэлую плеяду маладых і таленавітых мастакоў Узбекістана, вядомых сёння не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой. Арнольд Ган быў членам Саюза мастакоў, заслужаным дзеячам мастацтваў Узбекістана, вядомым майстрам манументальных роспісаў і стварэння інтэр'ераў культурных і адміністрацыйных будынкаў у Ташкенце (інтэр'ер Музея гісторыі Узбекістана, Палаца мастацтва, станцыі метро "Праспект касманаўтаў" і іншыя). Ён быў выдатным музыкантам, любіў выконваць як класічныя творы, так і народныя песні, у тым ліку беларускія. Сам А.Ган прымаў актыўны ўдзел у рабоце БКЦ "Світанак", выбіраўся ў праўленне БКЦ. Заўсёды ахвотна адгукаўся на запрашэнне выступіць у Рэспубліканскім пансіянаце для ветэранаў вайны і працы, у канцэртных залах і студыях Ташкенцкай дзяржаўнай кансерваторыі, у Рэспубліканскім інтэрнацыянальным культурным цэнтры, у дзіцячых дамах... На жаль, у 1999 годзе ён пайшоў з жыцця.

Удзячнасць прадстаўнікоў дыяспары заслужыла Вольга Галаванёва, якая ўжо на заслужаным адпачынку. Карэнная беларуска на сваім вяку многае перажыла, прайшла праз вялікія цяжкасці і выпрабаванні.

Пастаянным актывістам "Світанка" з'яўляецца Валянцін Сулейкін. Неаднаразова ён выбіраўся ў Савет БКЦ і намеснікам старшыні цэнтра. Гэта мужны, з моцнай воляй і характарам чалавек. У гады другой сусветнай вайны яму выпала цяжкая доля малалетняга вязня фашысцкага канцлагера. Валянцін Яфрэмавіч выбіраўся сакратаром і віцэ-старшынёй Узбекскага савета былых малалетніх вязняў фашызму. Нягледзячы на сталы ўзрост і перажытыя выпрабаванні, ён і сёння прымае актыўны ўдзел у дзейнасці БКЦ, выступае ў канцэртных праграмах мастацкай самадзейнасці, на якіх выконвае беларускія народныя лірычныя і жартоўныя песні. Пра гэтага цудоўнага чалавека мастацкі кіраўнік цэнтра "Світанак" В.Цітова нават напісала паэму "Дараваная зямля", якая будзе выдадзена ў бліжэйшы час. У БКЦ ёсць шмат прыстойных людзей, напісаць пра ўсіх не дазваляюць рамкі артыкула. Усе яны ўносяць прыкметны ўклад у развіццё культуры міжнацыянальных зносін і паглыбленне духоўнасці ў рэспубліцы.

Штогод "Світанак" сумесна з іншымі культурнымі цэнтрамі РУз шырока адзначаюць агульнанародныя святы: Дні незалежнасці Беларусі (3 ліпеня) і Рэспублікі Узбекістан (1 верасня), Наўруз, велікодныя святы, Масленіцу, Дзень Перамогі — віншаванне ветэранаў другой сусветнай вайны. Акрамя гэтага, праводзяцца шматлікія паэтычныя вечары і дабрачынныя канцэрты: вечары паэзіі Якуба Коласа, Янкі Купалы, сучасных паэтаў; беларускай музыкі і песні; сумесныя з іншымі культурнымі цэнтрамі святкаванні Дзён славянскага пісьменства; сольныя канцэрты выканаўцы беларускай песні Вольгі Нугаевай і паэта-песенніка Валянціны Цітовай; літаратурна-музычныя вечары, прысвечаныя Дню абароны дзяцей, Дню настаўніка; вечары, прысвечаныя традыцыям, абрадам і звычаям беларускай сям'і, канцэрты да Міжнароднага дня моладзі; святочныя праграмы да Дня Канстытуцыі Рэспублікі Узбекістан; у 90-я гады праводзіліся канцэрты самадзейнага ансамбля БКЦ "Бэзавыя зоркі" і іншыя. Мерапрыемствы праходзяць у самых розных месцах: у Рэспубліканскім пансіянаце для ветэранаў вайны і працы (РПВВП), Рэспубліканскім Доме акцёра, Ташкенцкай дзяржаўнай кансерваторыі, Рэспубліканскім інтэрнацыянальным культурным цэнтры, у школах Ташкента, на рэспубліканскім тэлебачанні, у Ташкенцкім каталічным касцёле, у парку культуры і адпачынку імя З.Фурката, на плошчы Дружбы народаў, у Саюзе кампазітараў, парку імя Мірзо Улугбека, Нацыянальнай бібліятэцы РУз і Алішэра Наваі, Музеі С.Ясеніна...

У 2001-2002 гадах тэматыка мерапрыемстваў, дзякуючы дапамозе Рэспубліканскага інтэрнацыянальнага культурнага цэнтра і пасольства Беларусі, значна пашырылася. Былі праведзены сустрэчы ў пасольстве Беларусі Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла М.Дземчука з беларусамі-ветэранамі другой сусветнай вайны, удзельнікамі працоўнага фронту і малалетнімі вязнямі, урачыстасці з нагоды Дня Рэспублікі Беларусь, у якіх прымалі ўдзел прадстаўнікі дыяспары, пасольстваў, творчай інтэлігенцыі Узбекістана. На новым узроўні прайшло святкаванне гадавіны БКЦ "Світанак". Сёлета пачата правядзенне тэматычных вечароў — "Славутыя землякі", прысвечаных вядомым беларусам. 1 чэрвеня 2002 года "Світанак" прыняў удзел у дабрачыннай акцыі, прысвечанай Дню абароны дзяцей пад патранажам Мітрапаліта Ташкенцкага і Сярэднеазіяцкага Уладзіміра. 30 красавіка 2002 года ў рамках святкавання 120-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа БКЦ сумесна з Нацыянальнай бібліятэкай РУз., Музеем С.Ясеніна для студэнтаў і навучэнцаў навучальных устаноў Ташкента праведзены літаратурныя вечары.

Заканчэнне будзе.

Нэла МАНДРАЛЬСКАЯ,
кандыдат гістарычных навук.

ДАВЕДКА ПРА АЎТАРА.
Мандральская Нэля Віктараўна — этнічная беларуска. Нарадзілася ў Беларусі. Пасля заканчэння Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М.В.Ламаносава жыве і працуе ва Узбекістане. Дацэнт Ташкенцкага універсітэта інфармацыйных тэхналогій.

уражанні

ПЯШЧОТНАСЦЬ І ГНЕЎ

Калі пачынаеш чытаць новую кнігу добра знаёмага паэта, узнікае пытанне: што новага нясе гэта кніга чытачу, што дае яму чарговая сустрэча з паэтам? Атрымаўшы кнігу "Памяці гаючая трава", я зноў перачытаў зборнікі вершаў Станіслава Валодзькі "У вачах Айчыны" (1996), "Обращение к сердцу» (1998), яго вершы, надрукаваныя ў зборніках "Dzejas dienas" ("Дни поэзии"). Шэраг вершаў, што ў рускамоўным варыянце складалі кнігу "Обращение к сердцу», паэт уключыў у новую кнігу ў арыгінале. Тут яны адкрыюцца чытачу новымі гранямі, таму што ўпісаны ў новы паэтычны кантэкст і ўяўляюць сабой этапы адзінага лірычнага сюжэта новай кнігі.

Аб тым, што прыдае кнізе адзінства, што становіцца яе лейтматывам, паэт заяўляе, выносячы ў загаловак слова "памяць". А малюнак на вокладцы — шматколернае лугавое разнатраўе (мастак Валеры Підгара) ператварае гэта слова-разуменне ў вобраз "трава памяці". "Гаючая трава" зажыўляе душэўныя раны, беражэ памяць аб мінулым і веру ў будучыню. Гэты вобраз стане асновай і цэнтрам мастацкага свету кнігі, ён будзе вар'іравацца ў руху яе лірычнага сюжэта.

У вершы, які пачынае кнігу, акрэслены контуры яе мастацкай прасторы і часу: час быцця лірычнага героя паўстае як прастора яго "жыццёвага маршруту" — ад першай кропкі, кропкі адліку, да апошняй. Між імі — мноства "кропак", якія адна за адной вырысоўваюцца перад поглядам чытача, складаючыся ў лінію жыцця, размешчаную "на карце вялікай".

Слова "карта" першапачаткова выступае ў сваім "геаграфічным" значэнні, абазначаючы прастору краіны, Радзімы героя. Аднак услед за тым у гэтым слове адкрываецца іншы сэнс: яно становіцца часткай выразу "паставіць на карту" (выбраць сваё прызначэнне, свой лёс):

Пастаўлены лёс твой
На карту Айчыны.

Так сувязь героя з Радзімай адкрываецца не толькі ў яе вонкавым, прасторавым вымярэнні: ён жыве на яе прасторах, але і ў духоўным, маральным аспекце яго лёс звязаны з ёю, з яе лёсам.

Знакам гэтай сувязі становіцца вобраз пуцяводнай ніці ў аднайменным вершы: трымаючыся за яе, працягнутую з краю дзяцінства, чалавек ідзе па жыцці. Метафара "пуцяводная ніць" — паэтычна шматгранная: сумяшчаючы зрокавы і слыхавы планы ("свеціць у цёмную ноч", "звініць струной"), яна ўзвышаецца да смелага параўнання з тэлефонным провадам, па якім можна пазваніць у мінулае.

Хто адарыў паэта гэтай праведнай ніццю, якая заўсёды вядзе да дабра? Самы дарагі яму чалавек — мама, ёй будуць прысвечаны самыя пяшчотныя, самыя сардэчныя яго вершы.

Лірычны сюжэт, у адрозненне ад эпічнага, — гэта не паслядоўнасць падзей, дзеянняў, учынкаў, а чаргаванне думак, пачуццяў, перажыванняў героя, выкліканых да жыцця яго ўражаннямі ад падзей, ці — як у кнізе "Памяці гаючая трава" — успамінамі аб іх. Паэт успамінае тое, што адбывалася ў розны час і ў розных месцах, і на паэтычнай карце Радзімы з'яўляюцца новыя і новыя вобразы і карціны.

Вось касцёл у Міхалішках, дзе бралі шлюб яго бацькі і дзе хрысцілі яго самога. Але паэт бачыць у гэтым помніку касцёльнай архітэктуры не толькі дарагую яму кропку на біяграфічнай лініі — у жыцці яго і яго сям'і; ён гаворыць аб гістарычнай ролі гэтага касцёла ў жыцці многіх пакаленняў землякоў, знаходзячы для гэтага дакладны вобраз — "сувязны стагоддзяў".

Калі паэт аглядае мысленным позіркам сваю Беларусь — і ў прасторы, і ў часе ён бачыць не толькі светлае, але і сляды, пакінутыя вайной:

Па ўсёй Беларусі
бяздомныя печы,
Стаялі ад гора ўчарнелыя
печы.

Печы — адзінае, што заставалася ад спаленых вёсак; да іх звярталіся многія паэты, мастакі, кінематаграфісты. Але Валодзька не толькі ўзнаўляе воблік гэтага знака бяды, — ён напаўняе яго "ачалавечаным", адухоўленым сэнсам: печы ў яго вершы пачарнелі не ад агню, — яны пачарнелі ад гора, як жывыя істоты, якія сумуюць, таму што не могуць сагрэць сваім цяплом людзей.

Сапраўды шчымлівы вобраз знайшоў паэт, гаворачы аб ветэранах, на грудзях у якіх "зорна ззяюць" медалі. Адштурхнуўшыся ад звычайнага выразу "два бакі медаля", ён раскрывае ў ім журботны, трагічны сэнс:

З аднаго боку —
свет, вясною ўбраны,
Дыханне разняволеных
палёў...
І зраненыя сэрцы
ветэранаў
З другога боку гэтых
медалёў.

Верш аб ветэранах вайны азначае рух лірычнага сюжэта з мінулага часу ў цяперашні. Сённяшняму дню належыць вобраз "белыя плямы гісторыі" — традыцыйны, але паэтычна пераасэнсаваны: у эпітэце "белы" паэт бачыць не проста эмацыянальна нейтральнае азначэнне колеру. Ён успрымае яго як колер снегу, а снег як сімвал забыцця, таму што снег белы, халодны, раўнадушны, ён накрывае зямлю, не даючы прарастаць траве памяці.

Так паварочваецца новай гранню загаловачны вобраз кнігі. Калі пад сонцам праўды растаюць апошнія астраўкі белых плям гісторыі, — "памяць травой з глыбіні прарастае":

Гэта трава нас ад
немачы лечыць.
Гэтай травы так баіцца
ўся нечысць.
Можа, на гэту траву,
нам на долю,
Снег забыцця ўжо
не выпадзе болей...

У публіцыстычных вершах сюжэтны час раскрываецца гранічна шырока, ахопліваючы не толькі мінулае і сучаснае, а імкнучыся ў будучыню; так усталёўваецца адказнасць тых, хто жыве зараз, і перад продкамі, і перад нашчадкамі.

Гэты матыў, здавалася б, нечакана, а па сутнасці заканамерна ўзнікае ў вершы, дзе дзейнічаюць і прашчуры, і нашчадкі, але не ў аддаленай рэтраспектыве і перспектыве, а ў бліжняй, сямейнай:

Як сынок мой маленькі,
таксама
Я на рукі прасіўся.
Вось так
Мяне бралі і тата, і мама. —
На руках рос, як хлеб
на лістах.

Гэты верш трэба абавязкова дачытаць да канца, каб стаў ясны сэнс параўнання "як хлеб на лістах":

Як і мне, мае дзеці, дай Бог
вам
Рукі родныя
помніць заўжды.
Так лісты западаюць
у бохан,
Пакідаюць адбіткі-сляды.

Гэты кранальны вобраз рэхам адгукаецца ў наступным вершы:

О, дзяцінства маё,
ты само, як нядзеля,
Як пірог на пахучым
кляновым лісце.

А на старонцы, якая раздзяляе гэтыя вершы, — фотаздымкі мамы паэта Францішкі Іосіфаўны.

Так сюжэт кнігі робіць паварот, дакладней, пераходзіць на новы віток спіралі: не проста вяртаючыся да матываў дзяцінства, сям'і, але і развіваючы, паглыбляючы іх.

Дакументальныя фотаздымкі натуральна ўваходзяць у мастацкі свет кнігі. Яны не прыкладваюцца да вершаў, не дапаўняюць іх, а суіснуюць з імі і з малюнкамі В.Підгары — на роўных правах як арганічны элемент мастацкага тэкста. Вершы і фотаздымкі ўзаемна пацвярджаюць адзін аднаго. І калі б пры чытанні паэмы "Аднаасобнік" у нас перад вачыма не было фотаздымка яе героя, наша ўяўленне аб ім было б няпоўным.

Быць сапраўдным паэтам, сцвярджае Валодзька, — гэта значыць, праяўляць чуласць да таго, як жывуць людзі, да іх радасцей і — асабліва — нягод. Валодзька не баіцца дэкларавацъ, звяртацца да чытача з павучаннем, асабліва ў вершах "Свайго сумлення не губі...", "Слова на дарогу".

Да суседзяў па краіне і па планеце — дзеячаў мастацтва і асветы звяртаецца паэт у вершах "На слынны юбілей Эдварда Вайвадзіша", "Кастусь Езавітаў", "Памяці Сяргея Сахарава", "Памяці Казіміра Сваяка".

Знамянальная пераклічка вершаў "Ля помніка маці Райніса ў Віцебску" і "На Кургане Славы Адама Міцкевіча ў Наваградку". Тут суседнічаюць ужо не толькі людзі, але культуры і краіны: Беларусь, Латвія, Польшча...

І ў лёсе Станіслава Валодзькі злучыліся дзве краіны — Беларусь і Латвія, звязаныя, як ніццю, ракой — Дзвіной-Даўгавай. Яна цячэ праз Віцебск, Полацк, Даўгаўпілс — горад, дзе паэт "знайшоў свой прычал":

Знайсці прычал свой лёс
Бог даў мне, —
Якая ў тым мая віна? —
У той краіне,
дзе — Даўгава,
Не ў той краіне,
дзе — Дзвіна.

Бягуць мае сыночкі жвава,
І галасочкі іх звіняць
У той краіне,
дзе — Даўгава,
І так не часта,
дзе — Дзвіна...

Мы пачулі галасы дзяцей паэта, а на фотаздымку, дадзеным на пачатку цыкла вершаў, што завяршае кнігу, мы бачым іх — Антона і Алега разам з бацькамі — Вольгай і Станіславам. І зноў, як і раней, вершы і сямейны партрэт сцвярджаюць адзін аднаго. Галоўнае ў гэтым цыкле — любоў: да жонкі, да дзяцей, да блізкіх людзей. Гэта пачуццё нясе ў сабе мноства адценняў, і выяўляецца яно ў мностве інтанацый: пяшчотнасць ("Ты мая Купалінка", "За ўсе скарбы..."), светлы смутак ("Элегія", "Мірта"), высокі пафас ("Цябе я зноўку прыручыў..."), лёгкі гумар ("Маналог цешчы", "Аднойчы і заўжды"). Каб перадаць падабенства дум і пачуццяў тых, хто ўзаемна кахае, паэт знаходзіць арыгінальныя "сучасныя" параўнанні:

Агортвае, натхняе
нас любоў:
Як вершы, мы жыццё
сваё складаем.
Як добра мы рыфмуемся
з табой,
І нашы біярытмы
супадаюць!

Чым жа завяршаецца лірычны сюжэт? На мой погляд, двума вершамі, у якіх сабрана разам тое, з чым пазнаёміліся мы, вандруючы па мастацкаму свету кнігі, — вопыт продкаў. Паэт вяртаецца да пачатку — і да таго, з чаго пачыналася кніга, і да "пачатку пачаткаў" — спадчыны пакаленняў.

Мне трэба жыць з усіх
Апошніх сіл часамі,
І за дзядоў сваіх,
І за бацькоў з братамі.

Так завяршаецца тэма памяці: памяць — гэта актыўная сіла, яна патрабуе быць адказным перад мінулым. Тады трава памяці будзе расці і квітнець.

* * *

Мы расстаёмся з кнігай Станіслава Валодзькі. Хачу завяршыць наша знаёмства з ёю словамі прафесара Эдуарда Мекша — рэдактара кнігі і аўтара прадмовы да яе: "Ён не гоніцца за вытанчанай рыфмай, не захапляецца постмадэрнісцкімі пошукамі, не эксперыментуе з рытмам і гукапісам. І ў той жа час у яго вершах ёсць усё: і гучная мелодыка, і выразны рытм, і метафарычная насычанасць, што мае цягу да сімволікі, дзе самыя галоўныя вобразы — жыццё, любоў, маці, Радзіма".

Леанід ЦЫЛЕВІЧ,

доктар філалогіі, прафесар.

Ізраіль.

постаці

Фота Яўгена КАЗЮЛІ.

Помнік Сымону Буднаму ў Нясвіжы.

супрацоўніцтва

ПАРЫЖ — ПАЛЕССЕ

ЮНЕСКА збіраецца садзейнічаць развіццю Палескага рэгіёна.

Пра гэта генеральны сакратар ЮНЕСКА Каіціра Мацуоры заявіў у Парыжы на сустрэчы з беларускай дэлегацыяй. Удзельнікі перагавораў, якія прайшлі ў рамках 165-й сесіі Выканаўчага савета ЮНЕСКА, у прыватнасці, дасягнулі дамоўленасці аб удзеле ЮНЕСКА ў правядзенні міжнароднага семінара, які збярэ магчымых інвестараў для ажыццяўлення праектаў па Палессі.

компас

КРОК У БЕЛАРУСКІ ІНТЭРНЭТ-АБШАР

Аб навінах можна даведацца з газет, радыё, тэлебачання, а цяпер яшчэ і з Інтэрнэта, перабягаючы па спасылках з сайта на сайт.

Да таго ж, вялікая колькасць выданняў уключае ў сябе не толькі навіны, але і аналітычныя артыкулы. Аб двух інфармацыйных выданнях беларускага інтэрнэта і пойдзе гаворка ў гэтым артыкуле.

Open.by — беларуская інтэрнэт-газета (www.open.by).

On-line газета Open.by выходзіць на рускай мове і складаецца з некалькіх раздзелаў:

Першая старонка — асноўная, на ёй размешчаны спасылкі на ўсе астатнія рэсурсы і анонсы матэрыялаў газеты, а таксама спасылкі на самыя папулярныя беларускія сайты.

Панарама — спіс артыкулаў, якія на сённяшні дзень размешчаны ў газеце, з анонсамі на некаторыя з іх.

Сёння ў газетах: «Дайджэст беларускай прэсы», «Інтэрнэт і камп'ютэры» — навіны з інтэрнэта, паведамленні аб навінках у электроннай і камп'ютэрнай галінах. А таксама курсы валют, паштовы індэкс, надвор'е ў Мінску, спорт-агляд, афіша, адпачынак і г.д.

Газета перыядычна абнаўляецца і не ўтрымлівае архіва старых навін.

Выдавецтва "Нестар" (www.nestor.minsk.by).

ТАА "Нестар" з'яўляецца заснавальнікам выданняў на розную тэматыку:

Камп'ютэры: «Компьютерная газета», «Сетевые решения», «Виртуальные радости», «Издательские системы».

Музыка: «Музыкальная газета», «Джаз-квадрат», «Музыкальный журнал», «ENGEXTREME MUSIC NEWS».

Будаўніцтва: «Строительство и недвижимость», «Строительный бизнес».

На сайце можна знайсці архіў нумароў гэтых газет і часопісаў у сецявым варыянце. Усе матэрыялы знаходзяцца ў адкрытым доступе.

Вольга ВАЙТУСЁНАК.

апавяданне

ПЕРШЫ ПАЦАЛУНАК І... ОРДЭН "СЛАВЫ"

Роднаму дзядзьку свайму, які прайшоў тры вайны, Васілю Якубаву, прысвячаю.

Апошнім часам я рэдка падвожу пасажыраў, якія галасуюць. І нават калі еду адзін з Мінска ў Бабруйск, стараюся не рызыкаваць. Што зробіш, калі ёсць на тое прычыны: аўтамабільныя разбойнікі нахабнічаюць, "працуюць" з артыстызмам, іх фантазіі і пераўвасабленню могуць пазайздросціць масцітыя кінадраматургі, якія мараць стварыць сучасны дзтэктыў.

Але ў той дзень я здрадзіў сваім прынцыпам, магчыма, таму што быў добры настрой: ехаў на дзень нараджэння да ўнучкі Тані. Можа, таму што час быў яшчэ не "рабаўнічы", ранні — пачатак дванаццатай гадзіны, а можа, таму што мужчына, які энергічна размахваў рукамі, ніяк не паходзіў на тых удальцоў, якія выдаюць сябе за бедных студэнтаў, а праехаўшы некалькі кіламетраў за горадам, накідваюць вадзіцелю на шыю пятлю ці ў лепшым выпадку — выкідваюць яго з машыны.

Пасажыру было яўна за шэсцьдзесят. І пры гэтым "галасаваў" ён, як запраўскі вопытны падарожнік, правай рукой махаў у бок Магілёва, а левай паказваў у бабруйскім накірунку. Любы вадзіцель здагадаецца: пасажыру патрэбна менавіта туды. Затармазіў.

— Дзякуй! — сказаў ён, адкрываючы дзверцы, крыху задыхаўшыся. — У Бабруйск?

Я кіўнуў. Падарожнік кінуў невялікую палатняную сумку на задняе сядзенне і ўсеўся побач:

— На аўтобусы білетаў няма аж да васемнаццаці... А на паравозе — трэба перасадку рабіць недзе ў Есіховічах ці Ісіповічах...

— У Асіповічах, — удакладніў я.

— Магчыма... Я сам не мясцовы. З Курска... Адпачываю ў Бабруйску, у санаторыі. Прыязджаў да сябра, былога аднапалчаніна. І трэба ж... памёр летам... Зрэдку абменьваліся паштоўкамі... Ваявалі разам. Ён у мяне быў двойчы — работа дазваляла. Круціў баранку дальнабойшчыкам. Я сам таксама ад'ездзіў сорак гадкоў з гакам, у асноўным на таксі. А калі з дачай звязаўся, во дзе хамут: ні выхадных, ні прахадных — усе адпачынкі, гадоў дваццаць, на дачы і правёў. А ў вас ёсць дача?

— Пакуль няма.

— І дзякуй Богу! Гэта, брат, такое, ведаеш-разумееш, ярмо — горш за пакаранне, — ён перадыхнуў, зняў мутонавую шапку, прыгладзіў рэдкія сівыя валасы і зноў загаварыў:

— А тут выклікаюць у ваенкамат... Прапануюць бясплатную пуцёўку, ды яшчэ куды? Знарок не прыдумаеш: мала таго, што ў Беларусь (я ж пасля ранення ў жніўні сорак чацвёртага больш у вас не быў), дык яшчэ і ў Бабруйск. У мяне пад Бабруйскам... Эх, маці родная, адшукаць бы тую мясцінку... Такі выпадак выпаў, ведаеш-разумееш, каму ні раскажу — ніхто не верыць... Словам, кінуў усю гаспадарку жонцы і махнуў... Верыце? Не шкадую. Добры санаторый: кармёжка выдатная і абслуга на вышыні... Месца добрае. Шкада вось, Івана не застаў... Нічога не напішаш... Наш час адыходзіць. Некаторыя яшчэ чапляюцца за жыццё, але...

— А што за выпадак вы ўспомнілі? — спытаў я, паварочваючы машыну ўправа, на Бабруйск.

Ён дабрадушна засмяяўся:

— Так... Часта ўспамінаю... Ужо ўнукам расказаў. Двое іх. — Ён памаўчаў, расшпіліў куртку (у салоне было цёпла) і прадоўжыў: — Я сам з дваццаць пятага... Да вайны ў вёсцы жыў. На вайну, як і многія хлопчыкі-равеснікі, збягаў двойчы. Вярталі. У сорак трэцім удалося... Прымазаўся, ведаеш-разумееш, у конна-механізаваны корпус генерала Пліева, нябось чулі?

— Вядома.

— Там мяне на курсы шафёраў... Вучоба паскораная. Сеў на палутарку пры санбаце... Ваяваў, як усе. Нічога асаблівага... Але, праўда, нагледзеўся на чалавечае гора пад завязку... Аднойчы давялося ўдзельнічаць пры пакаранні "самастрэла". Малады хлопец, гады на два старэйшы за мяне... прастрэліў абедзве нагі, а затым яшчэ і прымарозіў. Гангрэна... Ампутавалі да каленяў. Падлячылі... «Тройка»... Суд... Здрада Радзіме! Расстрэл! Што толькі ні прыдумвалі: і праз буханку хлеба страляліся, і праз "другі фронт" — гэта калі адзін трымае бляшанку амерыканскай тушонкі каля месца ранення, а другі страляе... Усё роўна раскрывалі. Рэдка каму дваццаць пяць ці штрафбат, у асноўным — паказальная вышка...

Дык вось, прывожу яго, бедачыну, у лясок, на ўскрайку вёскі дзесьці на Смаленшчыне: выстраілі полк, выкапалі яму... Маёр з асобага аддзела загадвае мне дапамагчы здрадніку Радзімы дабрацца да месца пакарання... А чаго там дапамагаць? Калі той без ног... Зразумелая справа: несці трэба. Узяў яго, як дзіця малое, і нясу да свежага пясочку. А той як заплача, як загалосіць: "Мамачка родная, прабач! Светачка любімая, бывай! З-за вас, з-за любві да вас стварыў непатрэбнае..." Плача і так дрыжыць... Яго дрыжыкі і мне, ведаеш-разумееш, перадаліся. (Падарожнік памаўчаў, кашлянуў пару разоў, відаць, стрымліваў хваляванне).

Зачыталі загад: за што і чаму. Крычаць: садзі, маўляў, яго каля ямы... А той учапіўся, нібы клешч, за шыю — не адарваць! Падбеглі яшчэ двое: тудысюды, ніяк, мёртвая хватка... Чую непрыстойную лаянку ззаду і раптам стрэл проста пад вухам. Аказваецца, асабіст выхапіў "ТТ", адвярнуў яго, няшчаснага, галаву ўбок і, як парасяці, выстраліў за вухам.

Той задрыгаўся, як прыпадачны, а рукі не адпусціў. Я вызваліўся, а яго так і кінулі ў яму... са скручанымі рукамі. Дні тры не мог апамятацца. Барані Бог, перажыць падобнае нават ворагам нашым! — падарожнік зноў зрабіў доўгую паўзу.

— Гэта здарылася ў пачатку ліпеня сорак чацвёртага — Бабруйск узялі дваццаць дзевятага чэрвеня. Трэцяга ліпеня — Мінск, іншыя гарады... Мы праз Старыя Дарогі на Баранавічы рушылі. Выклікае камандзір роты пад вечар і гаворыць: "Вунь ля студні "Віліс", і бачыш — "краля", ты з ёю асцярожней: старшы медфельчар... Пасля ранення дабіраецца ў сваю часць. Іх штаб недзе тут, — ён тыкнуў пальцам у карту і зрабіў кружок ля надпісу "Гарохаўка", — злятай туды і назад... Вазьмі на ўсякі выпадак "шмайсер" і звязку-другую гранат. Глядзі ва ўсе вочы: у лясах яшчэ немцы шляюцца, у бойку не лезуць, ухіляюцца, але здараецца... Тут недалёка, кіламетраў дзесяць, там ні хвілінкі: адразу ж назад! Зразумеў? Кругом! Бягом!

Падыходжу да "Віліса"... Яна — малодшы лейтэнант. Нічога з сябе — ладная, спадніца крыху ніжэй за калені. Усміхнулася, і тут жа дзве ямкі з'явіліся на ружовых шчоках. "Мяне, — гаворыць, — завуць Яна, а цябе?" — перайшла яна адразу на "ты". Я адказаў. Завёў стары джып, яна села побач, пад'ехалі да старшыны, і я больш для праформы выканаў параду камандзіра роты: узяў дзве звязкі гранат па тры штукі, нямецкі "шмайсер" і два запасныя ражкі...

Едзем. Яна гаварлівай аказалася. Мінут праз трыццаць я ведаў пра яе ўсё. Масквічка, студэнтка медтэхнікума, сірата: бацька будаваў Беламорканал, маці паехала наведаць яго і не вярнулася... Ёсць у яе сябар, начальнік фінаддзела роты. Дамовіліся ў Берліне ажаніцца. Пасля вайны ў медыцынскі інстытут не пойдзе. Вырашыла перакваліфікавацца ў педагогі і абавязкова чамусьці выкладаць гісторыю.

Дарога была, павінен сказаць, сапраўды "наша", "ваенная": ні праехаць, ні прайсці, чаго там толькі ні нагрувашчана... Аб'язджаем памалу і калдобіны, і варонкі ад мін і снарадаў, пра трупы і гаварыць няма чаго... Даводзілася — і па іх... А якое выйсце? Калі злева тэхніка, справа буралом, а яны, бедачыны нямецкія, па абодва бакі кювета адзін на адным, штабялямі... Выскачылі на поплаў: наперадзе паварот і адразу ж — пясчаны ўзгорак... Памятаю, яна ў гэты час маім асабістым жыццём пацікавілася: ці ёсць у мяне каханая? Я схлусіў, што ёсць, хоць да вайны наогул быў нецалаваным.

Вёска ў нас была... Як бы вам гэта сказаць... Ну чыста кацапаўская... Я сам таксама — чыстакроўны старавер. У нас па гэтай самай... маральна-амаральнай частцы, ведаеш-разумееш, быў жалезны закон: цалаваць мог толькі пасля заручын. Не дай Бог, нехта сілай, акрамя, вядома, велікодных звычаяў, — кроўная помста! Браты і дзядзькі яе так надаюць — дзесятаму закажаш... Цнатлівасць сваю распячатаў на дваццаць першым годзе ў шпіталі... З начальнікам клуба — Нінай звалі... Трыццацігадовай прыкідвалася, сапраўды выглядала вельмі маладой, а калі даведаўся, ёй аж сорак два... Маёй матулі тады трыццаць дзевяты ішоў... Калі б даведалася, царства ёй нябеснае, — пракляла б!..

Я на другую хуткасць пераключыўся — газку, на горку — умомант, з горкі ўніз і па тармазах. Яна мне крычыць: "Разварочвайся, у рот табе... гэта самае..." І маму маю чамусьці ўспомніла, і Бога, і ўсіх, здаецца, яго настаўнікаў. А мяне нібы нехта абухом па галаве шарахнуў... Жыццё пражыў, больш такога страху не адчуваў...

За прыгоркам было невялікае балотца, пакрытае высокім густым багуном, а на ім... Хто сядзіць, хто ляжыць, хто ўжо ўстаў — чалавек трыста, не менш, немцаў.

Яна, відаць, улавіла маю нечалавечую збянтэжанасць і ўжо мякка, ціха прашаптала: "Ладна, стой... Няма сэнсу..." Я азірнуўся назад: з-за кустоў паказалася яшчэ чалавек сорак. Брудныя, абарваныя, многія раненыя, стомленыя, а магчыма, і п'яныя. Яны рушылі да машыны. Ачуняўшы, я ўспомніў пра "шмайсер" і пацягнуў яго да сябе. Яна спыніла мяне і, як мне здалося, нават крыва ўсміхнулася: "Не дражні гусей! Мы крыху спазніліся... — сказала яна, падцягваючы да сябе абедзве звязкі гранат. — Ну што, Ваня Курскі, — назвала яна мяне чамусьці Іванам, хаця я выразна назваўся Трафімам, — пакажам гэтым вырадкам, як умеюць прыгожа паміраць рускія? Не дрыжы... ты паглядзі, колькі іх з сабой прыхопім! — Яна нахілілася да мяне і шэптам прапанавала: — Давай развітаемся палюдску..."

Цягне абедзве звязкі гранат правай рукой, мяне ахоплівае левай, а вуснамі прысмоктваецца да маіх вуснаў... Ды так... Далібог, жыццё ўжо на зыходзе, не магу пахваліцца, што надта многіх, ведаеш-разумееш, цалаваў... Але той пацалунак быў адзіны. Спачатку адчуў трапяткі запал і пах жаночага цела... Праз секунду-другую — смерць... Я, ведаеш-разумееш, паплыў...

І раптам чую: "Гер афіцэр, фрау... Дзе ест палон?" Мая цалавальшчыца тут жа мяне адштурхнула і як закрычыць: "Ахтунг! Смірна!" Гляджу: яны ўсе замерлі... Яна ім нешта па-нямецку хутка малола хвілін пяць. Назіраю спадылба: некаторыя ўсміхаюцца, а іншыя нават зубы ашчэрылі... Яна нахіляецца да мяне, яшчэ больш дрыжыць, але гэтак жа горача цалуе... Гляджу, яны гурбой пачалі кідаць сваю зброю ў машыну. Праз некалькі хвілін пастроіліся і — уперад трухам, мы за імі на першай, другой хуткасці...

Едзем. Яна нахіляецца да мяне, б'е па плячы і гаворыць: "А ты маладзец! Своечасова і, галоўнае, правільна зарыентаваўся... Калі б кінуліся ўцякаць, яны б зрабілі з нас рэшата, — і засмяялася, як дзіця. — А так бачаць, што мы іх не баімся... Ды яшчэ цалуемся, — яна пырскнула ўзахлёб, — вось і падабрэлі... Пацалунак — гэта магічная сіла, — яна пагладзіла мяне па патыліцы і паблажліва дадала: — Праўда, цалавацца Ваня Курскі не ўмее... Ну нічога, мы яго навучым".

Засветла дабраліся да сваіх. Больш я яе не бачыў. У дывізіённай газеце адзначылі абоіх. З узнагародай павіншавалі: ёй — "Чырвоны Сцяг", мне — "Славу" трэцяй ступені...

...Уехалі ў Бабруйск, Трафім папрасіў высадзіць яго дзе-небудзь бліжэй да санаторыя. Я давёз яго да цэнтральнага ўваходу. Ён дастаў кашалёк расплаціцца. Я грошай з яго не ўзяў. Тады ён, забіраючы сумку, палажыў на сядзенне пакет і на развітанне сказаў:

— Сам я не п'ю... Зусім... Думаў з Іванам прыняць па кроплі. А бачыш як — спазніўся! Вып'еш з кім-небудзь за нас, — зачыніў дзверцы і хутка пайшоў.

Я захаваў бутэльку каньяку да 9 Мая. На свята выпілі з братам за ўсіх, каму аддаём даніну павагі і ўдзячнасці ў гэты дзень, і... за падарожніка...

Мікалай МАНОХІН.

ракурс

ПРЫГАЖУНІ

Самыя розныя інтарэсы ў шасцікласніц Квасевіцкай сярэдняй школы Іванцэвіцкага раёна Алесі БАБЕЙ і Наталлі ГОЛУБ (на здымку). Дзяўчынкі добра вучацца, захапляюцца эстраднымі танцамі, вязаннем, чытаюць шмат мастацкай літаратуры, займаюцца ў школьным драматычным гуртку.

Фота Рамана КАБЯКА, БелТА.

экстрым

ГУЛЬНЯ ДЛЯ АВАНТУРЫСТАЎ

Калі-нікалі нават дарослым сур'ёзным людзям пачынае дакучаць іх размеранае жыццё, і тады яны шукаюць нешта, што б скрасіла шэрыя будні. Магчыма таму ў Мінску з'явілася "Схватка".

"Схватка" — гэта гульня, якая цесна пераплятаецца з рэальным жыццём. У першую чаргу яна разлічана на тых, хто шмат часу праводзіць у інтэрнэце, каб вырваць іх з кіпцюроў сусветнага павуціння, вярнуць ненадоўга ў рэальнае жыццё. Сама па сабе гэта ідэя не новая, падобныя гульні ўжо існуюць у свеце, але на Беларусі "Схватка" з'явілася ўпершыню. Інтрыга яе заключаецца ў выкананні розных місій, на што не заўсёды лёгка адважыцца. Для гульні неабходны машына, мабільнік, ліхтарык і каардынатар, які будзе сядзець у інтэрнэце і паведамляць удзельнікам заданні па тэлефоне.

Удзельнічаць у "Схватцы" могуць толькі тыя, каго называюць "сарвігалава", хто можа скокнуць у адзенні ў халодную ваду Свіслачы або жабраваць у трамваі. Але заданні гульні такія цікавыя, што людзі з задавальненнем бяруцца за іх выкананне. А каб карціна была поўная, прывяду прыклады некаторых з іх. Аднойчы "схватчыкам" трэба было знайсці ў Мінску чалавека, пра якога яны нічога не ведалі, акрамя прозвішча, і выведаць у яго пароль для наступнага задання. Знайсці яго ўдалося ў нейкім клубе на ўскраіне, пароль ён сказаў, але за гэта адзін з удзельнікаў паплаціўся сваімі валасамі, якія былі коратка падстрыжаны і пафарбаваны ў зялёны колер.

Ці вось яшчэ прыклад: трэба было ў "МакДональдсе", што каля вакзала, сабраць у адну чаргу 39 дзяўчат. Што там рабілася — не перадаць! Каманд было шмат, суадносна і чарга з дзяўчатамі была не адна. А потым у абсалютна глухога, нямога і сляпога дзеда трэба было выпрасіць дыскету, на якой быў запісаны пароль. Дыскету выбілі і камп'ютэр уначы знайшлі, але дыскета была пустой, а код быў напісаны маленькімі літарамі на самой дыскеце.

Такім чынам, здарэнняў, нечаканасцей і ўражанняў хапае, у крыві ўздымаецца адрэналін, і жыццё становіцца цікавейшым!

Вольга ВАЙТУСЁНАК.

«Голас Радзімы»
Галоўны рэдактар
Наталля САЛУК

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь;
Камітэт па справах рэлігій і нацыянальнасцей пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь;
Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі;
Беларускае таварыства па сувязях з суайчыннікамі за рубяжом «Радзіма».

Наш адрас: 220005, Рэспубліка Беларусь, Мінск, пр. Ф. Скарыны, 44.
Тэлефоны: (+375-17) 288-11-97 (бухгалтэрыя, тэл./факс), 288-12-80, 284-76-56, 288-17-82.

Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках «Голасу Радзімы», могуць не супадаць.

Рэгістрацыйнае пасведчанне №81. Падпісны індэкс у Беларусі 63854. Тыраж 2 093 экз. Заказ 2430. Падпісана да друку 21. 10. 2002 г. у 12.00.

Газета набрана і звярстана на рэдакцыйным настольна-выдавецкім комплексе.

Аддрукавана ў друкарні «Беларускі Дом друку» (220041, г. Мінск, пр. Скарыны, 77).